БУДУЧЫЯ ЎРАЧЫ НА COVID-ФРОНЦЕ 2

НОВЫ ФАРМАТ СТАРОГА ЗАМКА Ў ГРОДНЕ 13

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

3 СНЕЖНЯ 2020 г. ЧАЦВЕР № 236 (29350)

ЦЫТАТА ДНЯ

Ірына КАСЦЕВІЧ, міністр працы і сацыяльнай абароны:

«Задача ўрада — забяспечыць годны ўзровень даходаў незалежна ад таго, якога ўзросту грамадзянін. Але гэта задача не толькі дзяржавы, але і самога чалавека. Памер пенсіі залежыць ад стажу працоўнай дзейнасці і ўзроўню заработнай платы, з якой чалавек сыходзіць на пенсію. Таму кожны павінен быць нацэлены максімальна доўга працаваць для максімальнага працоўнага стажу і, вядома, павышаць свой прафесійны ўзровень, каб забяспечваць кар'ерны рост і атрымліваць максімальна высокую зарплату».

КАРАТКА

- **Снежань сёлета ў Беларусі чакаецца цяплейшы, чым звычайна.**
- За суткі ў Беларусі зарэгістравана 1689 пацыентаў з COVID-19, выпісана 1608.
- **НАН Беларусі назвала лаўрэатаў прэмій для маладых навукоўцаў 2020 года.**
- У Беларусі правядуць прававы маніторынг ваеннага заканадаўства.
- **У цэнтры Брэста абсталявалі маршрут для слабавідушчых людзей.**
- Coca-Cola ў Беларусі прадставіла справаздачу пра ўклад у нацыянальную эканоміку за 2019 год.
- **У Шумілінскім раёне ў кар'еры знайшлі астанкі загінулых у гады вайны.**
- Дабрачынная акцыя «Цуды на Каляды» стартуе ў Беларусі 4 снежня.

ISSN 1990 - 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«У сучасных умовах саюзніцтва набывае ўсё больш важкі сэнс»

Пра гэта заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас саміту АДКБ, які адбыўся ўчора ў рэжыме відэа-канферэнц-сувязі.

Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на няпростыя ўмовы, у якіх ажыццяўляецца дзейнасць арганізацыі.

«Значнай дэфармацыі падвяргаюцца сістэмы міжнародных адносін і механізмы кантролю над узбраеннямі. У зносінах усё больш дамінуе канфрантацыйная рыторыка. Свет у чарговы раз стаіць на парозе развязвання некантралюемай гонкі ўзбраенняў, — пералічыў ён. — Абвастраюцца самыя небяспечныя з'явы, а менавіта ваеннае супрацьстаянне паміж сусветнымі цэнтрамі сілы».

Сур'ёзную занепакоенасць выказаў Прэзідэнт Беларусі з-за нарошчвання ваеннай прысутнасці ЗША і НАТА каля заходніх граніц АДКБ. «У першую чаргу гаворка ідзе аб размяшчэнні дадатковага амерыканскага кантынгенту ў Польшчы і яе планы па стварэнні новых аб'ектаў ваеннай інфраструктуры. Мы выразна бачым павелічэнне сістэмных мерапрыемстваў ваеннага характару на тэрыторыі гэтай краіны і ў дзяржавах Балтыі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

У Навагрудку — снег і снежань

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Электраманцёр Навагрудскай ЖКГ Дзмітрый МАКАРЧУК першы раз удзельнічае ва ўстаноўцы галоўнай навагодняй ёлкі на цэнтральнай плошчы горада. На аўтавышцы ён манціруе светлавыя гірлянды.

Спажывец

КАВУНЫ ПА-БЕЛАРУСКУ

Клімат мяняецца, і на нашы соткі прыходзяць нязвыклыя культуры

Доктар сельскагаспадарчых навук Мечыслаў СЦЯПУРА сцвярджае, што кавун у Беларусі сёння вырасціць лягчэй, чым агурок. Мы запыталіся ў Мечыслава Францавіча, загадчыка аддзела бахчавых культур РУП «Інстытут агародніцтва», як гэта зрабіць і чаму ў многіх не атрымліваецца.

Навошта вырошчваць, калі можна купіць?

Для тых, каму цяпер за 35-40 гадоў, кавун — гэта смак летніх канікул, шчасця і бесклапотнасці. І мы працягваем любіць гэтую гіганцкую ягаду, пасталеўшы. Але калі раней сезон кавуноў быў кароткі, сёння іх прадаюць і ў лістападзе, і нават у снежні: можна зладзіць сабе пасляновагодні «дэтокс» 1 студзеня не з дапамогай традыцыйнага расолу, а разрэзаўшы кавун.

СТАР. 4

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал або I паўгодзе 2021 года

НАЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«У сучасных умовах саюзніцтва набывае ўсё больш важкі сэнс»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па яго словах, пад прыцэлам ваеннай актыўнасці знаходзяцца не толькі нацыянальныя інтарэсы Рэспублікі Беларусь. У дадзеным кантэксце, лічыць кіраўнік беларускай дзяржавы, варта разглядаць і заявы НАТА аб распрацоўцы новай стратэгічнай канцэпцыі. «Мяркую, ужо ўсім ясна, супраць каго і чаго яна будзе накіравана», — заўважыў Прэзідэнт.

Беларускі лідар спыніўся на тэме санкцый. Ён звярнуў увагу, што такія міжнародна-прававыя меры павінны прымяняцца ў выключных выпадках і толькі для вырашэння найважнейшых пытанняў забеспячэння міру і бяспекі, але сталі штодзённай практыкай.

Пандэмія COVID-19 не толькі ўскладніла праблемы міжнароднага ўзаемадзеяння, але і справакавала абвастрэнне сацыяльных канфліктаў, дадаў Аляксандр Лукашэнка. «Ужо зразумела, што гэта не спантанная праява незадаволенасці, як нам імкнуцца паднесці ў СМІ. ***Міжнародны парадак дня скочваецца ў бок так званага кіраванага хаосу. У наяўнасці добра прадуманая і зрэжысіраваная дзейнасць глабальных гульцоў, якія часам не лічацца ні з чым, нават з інтарэсамі ўласных народаў»,*** — упэўнены Прэзідэнт.

У якасці прыкладу ён прывёў беспарадкі ў ЗША і краінах Еўропы. Апошнія да нядаўняга часу лічыліся ледзь не ўзорам дэмакратыі.

«Відавочна, што ***ўніверсальны баланс паміж грамадзянскімі свабодамі і інтарэсамі нацыянальнай бяспекі ў заходнім грамадстве так і не знойдзены,*** — зрабіў выснову кіраўнік Беларусі. — ***Мабыць, менавіта з гэтага вынікае ўсё больш бесцырымоннае навязванне сусветнай грамадскай свядомасці падвойных стандартаў».***

З аднаго боку, надзвычай жорсткая рэакцыя заходніх улад на пратэсты і ў цэлым непапулярная дзяржаўная палітыка падаюцца як аб'ектыўная неабходнасць, з другога — меры іншых краін па забеспячэнні стабільнага развіцця, падтрымання правапарадку і законнасці выстаўляюцца як дыктатура і дэспатызм, растлумачыў свой тэзіс Прэзідэнт.

«Ва ўмовах гэтых нераўнапраўных сістэм каардынат ***маніпуляванне людзьмі, прымяненне гібрыдных уздзеянняў і тэхналогій «каляровых рэвалюцый» сталі звычайнай з'явай,*** — адзначыў ён. — ***Менавіта таму Беларусь у 2020 годзе адчувае на сабе адкрытае ўмяшальніцтва ва ўнутраныя справы, у тым ліку праз правакаванне грамадзянскай незадаволенасці.*** Нам прама прапануецца памяняць уладу, законы і сацыяльныя арыенціры. У адваротным выпадку пагражаюць задушыць санкцыямі, разбурыць эканоміку і інфраструктуру, змяніць маральныя асновы нашага грамадства. Цяпер ужо няма сумненняў, што на коне стаялі і да гэтага часу стаяць грамадзянскі мір і цэласнасць нашай Беларусі».

Асаблівую ўвагу Прэзідэнт звярнуў на паводзіны Польшчы і краін Балтыі ў адносінах да Беларусі. «Мы выразна бачым, што іх дзеянні забяспечваюць рэалізацыю ўласных інтарэсаў і накіраваны на павышэнне сваёй значнасці ў Еўрасаюзе, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — І я хачу, каб пра нявартыя і бессаромныя паводзіны палітыкаў пачулі простыя людзі гэтых суседніх з намі краін».

Цяпер многія зразумелі, што свет не будзе такі, які ён быў год ці два таму, сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

«Аднак ва ўмовах паўсюднай канфліктнасці і з новымі хваробамі, што на нас абрынуліся, нам трэба будзе жыць і развівацца. Гадаваць дзяцей, радавацца дабру і адзін аднаму. ***Любымі спосабамі захоўваць тую тонкую і далікатную грань, якая аддзяляе чалавецтва ад катастрофы»,*** — дадаў ён.

Сёння ад членаў АДКБ з улікам дынамікі выклікаў і пагроз патрабуецца не проста падтрыманне існуючага ўзаемадзеяння, але і яго нарошчванне, лічыць Прэзідэнт.

«У сучасных умовах саюзніцтва набывае ўсё больш важкі сэнс. АДКБ павінна паказаць сваё ўменне інтэнсіўна, надзейна працаваць у палітычным, ваенным, інфармацыйным вымярэннях, а таксама эфектыўна супрацьстаяць тэрарызму і экстрэмізму, незаконнаму абарачэнню наркотыкаў, дзейнічаць на апярэджанне і пазбягаць сацыяльных бедстваў», — падкрэсліў беларускі лідар.

Важна не толькі своечасова выяўляць новыя выклікі і пагрозы, але і запускаць механізмы іх адбіцця, пры гэтым максімальна збліжаць пазіцыі дзяржаў-членаў па калектыўным рэагаванні, падсумаваў Аляксандр Лукашэнка і выказаў меркаванне, што гэта ў членаў АДКБ атрымаецца.

Пад канец свайго выступлення Прэзідэнт Беларусі заклікаў сваіх калег знайсці магчымасць для вочнай сустрэчы ў больш шырокім фармаце — з удзелам не толькі членаў АДКБ, але і іншых краін, якія разумеюць небяспеку цяперашняга часу.

«Сітуацыя ў свеце такая, што мы абавязкова павінны сустрэцца і з улікам урокаў апошніх падзей абмеркаваць перспектывы нашых дзеянняў, каб гэтага не дапусціць надалей ва ўсіх краінах. Нікому нельга самазаспакойвацца ў дадзенай сітуацыі, думаю, усе з нас гэта разумеюць», — сказаў ён.

Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін пагадзіўся, што сітуацыя ў Беларусі выклікае занепакоенасць, і не столькі ў сувязі з пратэсным рухам, колькі з-за ўмяшальніцтва звонку, фінансавай і палітычнай падтрымкі гэтага руху з-за мяжы.

«Трэба даць, нарэшце, народам самім разабрацца з пытаннямі, якія для іх прадстаўляюць асаблівы інтарэс. Мы бачылі, як адбывалася развіццё падзей, скажам, у арабскім свеце, падчас так званай «арабскай вясны», — сказаў ён. — Да чаго гэта прывяло? Я ўжо не кажу пра ўсякія іншыя «каляровыя рэвалюцыі». Заўсёды тлумачаць найлепшымі намерамі. А як вядома, добрымі намерамі выбрукавана дарога ў пекла».

Расійскі лідар выказаў спадзяванне, што беларускаму народу хопіць палітычнай сталасці для таго, каб «спакойна, без усякіх рэзкіх рухаў выбудаваць і ўнутрыпалітычны дыялог з усімі палітычнымі сіламі, і вырашыць усе свае ўнутраныя пытанні самім, без усялякага ціску і ўмяшальніцтва звонку».

«Не сумняваюся ніколькі, што атрымаецца, таксама, і з улікам палітычнага досведу Прэзідэнта Беларусі», — дадаў ён.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу калег на тое, што ў Беларусі адбываецца не «каляровая рэвалюцыя», а «звычайны мяцеж».

«Рэвалюцыя — гэта калі ёсць аснова для рэвалюцыі, мы ўсе з вамі вывучалі. Калі нізы не хочуць, вярхі не могуць і гэтак далей. І калі ёсць рэвалюцыянеры», — нагадаў ён змест падручнікаў гісторыі. У Беларусі, як і ў іншых краінах — членах АДКБ, няма рэвалюцыянераў, лічыць кіраўнік дзяржавы. ***«Усе рэвалюцыянеры хочуць жыць добра і пажадана за чужы кошт. І калі з імі пачынаеш размаўляць на іх мове, яны хутка ператвараюцца з так званых рэвалюцыянераў у беглых палітычных»,*** — дадаў ён.

Адносна падзей у Беларусі, справа, перакананы яе лідар, у тэрытарыяльных прэтэнзіях Польшчы. Ён прывёў адпаведную цытату, якую раней агучваў на сустрэчы з калектывам 6-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска. Размова пра выказванні польскіх палітыкаў, у якіх заяўляецца пра «гістарычную прыналежнасць беларускіх земляў Польшчы». «Гэта заяўляецца ўжо ў адкрытым рэжыме, — абурыўся Аляксандр Лукашэнка. — Слухайце, ***ці магу я як Прэзідэнт, і беларусы з гэтым пагадзіцца?*** Аказваецца там, дзе мы сёння жывём, — нам не належаць гэтыя землі. Ясна — каму. У гэтым кірунку і дзейнічаюць».

Да таго ж, беларускаму кіраўніцтву стала дакладна вядома пра стварэнне ваеннай групоўкі НАТА для захопу гэтых зямель, заявіў Прэзідэнт Беларусі. Яшчэ адзін намер заходніх палітыкаў — стварэнне «санітарнага пояса» паміж Еўрасаюзам і Расіяй, дадаў ён. «Гэта даўняя мара, гэта мэты, якія пасля распаду Саюза ў сярэдзіне 90-х не ўдалося рэалізаваць, — нагадаў беларускі лідар. — Хто-хто, але мы з Прэзідэнтам Расіі гэта вельмі добра разумеем. ***Падзеі ў Беларусі, адкрыта ўжо кажуць, — гэта трамплін для ціску на Расійскую Федэрацыю».***

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што не варта думаць, што краіны — члены АДКБ, якія знаходзяцца ў іншых рэгіёнах, у большай бяспецы.

«Нават пра падзеі ва Украіне думалі: «Гэта не ў нас». Не паспееце азірнуцца, як гэта будзе ў вас, — папярэдзіў калег Прэзідэнт Беларусі. — Таму нам трэба працаваць супраць гэтага зараз. Выкарыстоўваць пры гэтым горкі вопыт, у тым ліку, Беларусі. Дарэчы, што мы ўжо і робім разам з Расійскай Федэрацыяй».

Прэзідэнт падкрэсліў: ***«Нам як ніколі, пра што казалі ўсе, трэба быць сёння разам. Адзінымі. Але давайце шчыра будзем гаварыць, што аснова нашага адзінства сёння — эканоміка.*** Будзем мы тут бачыць адно аднаго, у эканоміцы, як мы даўно паставілі перад сабой мэту ў рамках Еўразійскага эканамічнага саюза, значыць, захаваемся. Не — Прэзідэнт Расіі дакладна пра гэта сказаў: па адным разбяруць і пакарыстаюцца».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

На слыху

БУДУЧЫЯ ЎРАЧЫ НА COVID-ФРОНЦЕ

Адмысловы кол-цэнтр па супрацьдзеянні ў распаўсюджванні каранавіруснай інфекцыі цяпер функцыянуе ў Гомелі. Студэнты Гомельскага дзяржаўнага медуніверсітэта такім чынам дапамагаюць у раннім выяўленні пацыентаў з гэтай каварнай інфекцыяй.

Мэта стварэння кол-цэнтра — узаемадзеянне з кантактамі першага ўзроўню, якія мелі ўзаемадачыненні з COVID-станоўчымі пацыентамі, што ў сваю чаргу дапамагае ў раннім выяўленні новага ачага інфекцыі.

У кол-цэнтры задзейнічаны адзінаццаць студэнтаў шостага курса. Яны штодня звязваюцца па тэлефоне з кантактамі І узроўню па COVID-19. Валанцёры збіраюць даныя аб стане іх здароўя. Потым гэтая інфармацыя аператыўна перадаецца ў гарадскія паліклінікі.

— Кол-цэнтр дзяржмедуніверсітэта пачаў супрацоўнічаць з дзвюма паліклінікамі Гомеля — гэта філіялы № 3 і № 7 Гомельскай цэнтральнай гарадской паліклінікі, — адзначыла **каардынатар кол-цэнтра ГДМУ Наталля БАКАЛЕЦ.** — У ВНУ перадалі спісы людзей, якія з'яўляюцца кантактамі першага ўзроўню: каля 40 чалавек з філіяла № 3 і больш за 50 — з філіяла № 7.

Па словах каардынатара, штодзень на працягу дзевяці дзён валанцёры з кол-цэнтра павінны звязвацца з патэнцыяльна захварэлымі на каранавірус і даведвацца аб іх самаадчуванні. На кожнага абанента запаўняецца чэк-ліст. Пры з'яўленні ў чалавека прыкмет вострай рэспіраторнай віруснай інфекцыі, адпаведную інфармацыю перадаюць у паліклініку, па месцы жыхарства грамадзяніна. Кантактная група выедзе да хворага ў гэты ж альбо наступны дзень. Усе адзначаныя пацыенты абавязкова абследуюцца на COVID-19.

У ВНУ патлумачылі, што размова з пацыентам па тэлефоне і забеспячэнне яго медыцынскай інфармацыяй — гэта своеасаблівая работа для маладых медыкаў, якая патрабуе належнай падрыхтоўкі.

— На шостым курсе ўніверсітэта выкладаецца такая дысцыпліна, як «Прафесійныя камунікацыі ў ахове здароўя». Студэнты вывучаюць асаблівасці зносін з пацыентамі з рознымі формамі захворванняў, — тлумачыць **прэс-сакратар ВНУ Алена СМІРНОВА.** — Таму перад пачаткам работы ў кол-цэнтры старшакурснікі прайшлі дадатковую падрыхтоўку. Так, былі арганізаваны адмысловыя семінары, на якіх змадэлявалі тэлефонныя кансультацыі і пэўныя сітуацыі пры размове з пацыентамі. Студэнты засвоілі патрэбныя алгарытмы зносін, каб пацыент атрымліваў даступную медыцынскую інфармацыю, а таксама маральную падтрымку. Будучыя ўрачы адпрацавалі практыку камунікацыі ў рэальным часе пры тэлефонным кансультаванні.

Семінары па падрыхтоўцы студэнтаў да работы ў кол-цэнтрах сталі працягам практыкаарыентаванага навучання ў Гомельскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце.

Між тым кол-цэнтр па кансультаванні пацыентаў з падазрэннем на COVID-19 плануе працаваць з усімі гарадскімі паліклінікамі. Акрамя таго, як растлумачылі ў ВНУ, зараз больш за 40 студэнтаў 6-га курса працуюць у паліклініках Гомеля: у чатырох дзіцячых і пяці дарослых. Будучыя ўрачы аказваюць меддапамогу ў складзе кантактных груп, працуюць у кабінетах даўрачэбнай дапамогі і вядуць прыём у кол-цэнтрах пры гарадскіх паліклініках.

— Мяркую, што ўжо цяпер можна казаць пра істотны ўнёсак студэнтаў Гомельскага дзяржмедуніверсітэта ў агульную супрацьэпідэмічную справу, што неацэнна пры цяперашняй нагрузцы на сістэму аховы здароўя, — адзначыла Алена Смірнова.

Прынамсі, у гэты час на базе Гомельскага дзяржмедуніверсітэта дзейнічаюць тры валанцёрскія атрады для дыстанцыйнага кансультавання і рэабілітацыі пацыентаў устаноў аховы здароўя Гомеля і рэгіёна.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

Парламенцкі дзённік

Чалавек, дзяржава і бізнес

Дэпутаты ўхвалілі праект Праграмы дзейнасці ўрада на перыяд да 2025 года

Галоўныя мэты дакумента, як паведаміў прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА, прадстаўляючы яго на пасяджэнні Палаты прадстаўнікоў — павышэнне дабрабыту насельніцтва і дасягненне высокіх стандартаў жыцця.
Гэты праект — адзін з ключавых праграмных дакументаў на сярэднетэрміновы перыяд, базісам якога з'яўляецца Праграма эканамічнага развіцця краіны. Па словах прэм'ера, Праграма дзейнасці ўрада, па сутнасці, яшчэ і дарожная карта рэалізацыі задач пяцігодкі. Яна ўключае чатыры блокі — сацыяльны, інстытуцыянальны, галіновы і рэгіянальны.

ПРА «САЦЫЯЛКУ»

Як сказаў кіраўнік урада, прадугледжаны ў дакументе пераход на новыя крытэрыі ўстанаўлення мінімальнага заробку ў памеры не ніжэйшым за 30 працэнтаў прагнознага значэння сярэднямесячнага заробку па краіне. Пры гэтым для бюджэтнікаў мае адбывацца паэтапнае павышэнне памеру базавай стаўкі.

«У рэальным сектары эканомікі будзе захаваны прынцып заработку грошай праз павелічэнне прадукцыйнасці працы. Акцэнт будзе зроблены на стымуляванне працоўных за высокаэфектыўную працу, удасканаленне сістэмы матывацыі кіруючага складу», — паведаміў кіраўнік Саўміна.

Па яго словах, мае адбыцца і перафармацірaванне ўсёй пенсійнай сістэмы краіны. Будзе больш задзейнічаны механізм прыватных пенсійных зберажэнняў і карпаратыўных пенсійных праграм наймальнікаў.

«Ва ўрадзе прапрацоўваюцца падыходы па падтрыманні сярэдняй пенсіі па ўзросце на ўзроўні не ніжэйшым за 40 працэнтаў ад сярэднямесячнага заробку па краіне», — дадаў Раман Галоўчанка.

Меры па падтрымцы сем'яў з дзецьмі будуць рэалізоўвацца за кошт удасканалення сістэмы дзяржаўнай і адраснай дапамогі, павышэння даступнасці жылля, павелічэння аб'ёмаў будаўніцтва арэндных кватэр, бясплатнага выдзялення ўчасткаў для ўзвядзення індывідуальных дамоў. Новае дыханне атрымае праграма сямейнага капіталу, плануецца пашырыць кірунке яе выкарыстання.

Ужо адказваючы на пытанні дэпутатаў, прэм'ер-міністр удакладніў, што скарачэнне водпуску па доглядзе за дзіцем знаходзіцца на стадыі абмеркавання. Адзін з механізмаў змяненняў — пакінуць яго трохгадовым, але аплачваць толькі два гады. Перад прыняццем канчатковага рашэння пытанне будзе абмяркоўвацца на дыялогавых пляцоўках на працягу наступных двух месяцаў.

Прэм'ер-міністр расказаў, што прадугледжваецца і карэкціроўка заканадаўства аб міграцыі: «Намаганні будуць накіраваны на скарачэнне адтоку насельніцтва, перадусім моладзі, наданне знешняй міграцыі зваротнага характару, папярэджанне ўцечкі мазгоў, а таксама стымуляванне прытоку ў краіну высокакваліфікаванай замежнай рабочай сілы».

ПРА БІЗНЕС

Адна з задач урада — стварэнне ўмоў для інвеставання, зніжэнне рызык для інвестараў і паляпшэнне бізнес-асяроддзя. Як паведаміў прэм'ер-міністр, працягнецца падтрымка праз стварэнне дзяржаўнай праграмы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва на 2021—2025 гады.

«Час рэалізоўваць права кіраўнікоў камерцыйных прадпрыемстваў на разумную дзелавую рызыку. Трэба забяспечыць сувымернасць пакарання са здзейсненым эканамічным правапарушэннем, — канстатаваў прэм'ер. — Таксама плануецца знізіць адміністрацыйную нагрузку на бізнес і выкараніць залішняе ўмяшальніцтва дзяржавы ў дзейнасць суб'ектаў гаспадарання».

Раман Галоўчанка прапанаваў стварыць шэраг буйных дзяржаўных карпарацый вытворчага і тэхналагічнага патэнцыялу па стварэнні новага прадукту для выхаду на замежныя рынкі не з асобнымі тавамі, а сістэмай машын, тэхналогій і лінейкай прадукцыі.

Таксама ўрад распрацаваў падыходы да аздараўлення праблемных дзяржпрадпрыемстваў. Гэтыя падыходы, на думку прэм'ера, трэба абмяркоўваць і ажыццяўляць. У залежнасці ад сітуацыі ранжыравалі прадпрыемствы на тры катэгорыі: плацежаздольныя, якія могуць развівацца самастойна без істотнай падтрымкі дзяржавы, прадпрыемствы з высокім узроўнем пазыковай нагрузкі і ўстойліва неплацежаздольныя.

ПРА ЭКСПАРТ

Тут, як расказаў Раман Галоўчанка, мэта на пяцігодку — нарасціць экспарт тавараў і паслуг да 50 мільярдаў долараў ЗША. Амаль удвая трэба павялічыць пастаўкі высокатэхналагічнай прадукцыі — да двух мільярдаў долараў. Прырост экспарту паслуг складзе каля пяці мільярдаў долараў. Разлічвае ўрад і на лідарства ў IT, рост у транспартнай сферы, будаўніцтве, турызме, медыцыне.

«Плануем стварэнне нацыянальнага экспартнага цэнтра на базе структур Банка развіцця. Гэта будзе новы інстытут падтрымкі, у яго аснове — прафесійны камерцыйны падыход па прасоўванні тавараў і паслуг на рынках, кіраванні імпартам, прыцягненні сродкаў для фінансавання экспартных праектаў», — сказаў кіраўнік урада.

ПРА РЭГІЁНЫ

Асноўная мэта рэгіянальнай палітыкі, як акцэнтаваў увагу Раман Галоўчанка, — скарачэнне разрыву па ўзроўню і якасці жыцця насельніцтва ў рэгіёнах.

«Па кожнай тэрыторыі, вобласці, горадзе Мінску, раёне ці горадзе абласнога падпарадкавання ў 2021 годзе будзе распрацаваны свой ключавы дакумент, які вызначыць арыенціры на чарговую пяцігодку», — паведаміў ён.

Для рэалізацыі мэт дакумента дэпутатам, паведаміў Раман Галоўчанка, неабходна прыняць 25 законаў, унесці змяненні ў сем кодэксаў.

Марыя ДАДАЛКА.

❍ КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

Святлана ГОРВАЛЬ, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па эканамічнай палітыцы, адзначыла, што Праграма дзейнасці ўрада адпавядае ўсім прыярытэтам і мэтам праграм сацыяльна-эканамічнага развіцця, у ёй адлюстраваныя задачы, абазначаныя Прэзідэнтам падчас выступлення з Пасланнем да народу і Нацыянальнага сходу. Дэпутат вылучыла меры па стварэнні спрыяльных умоў для бізнесу — змяншэнне відаў дзейнасці, якія падлягаюць ліцэнзаванню, змякчэнне ўмоў для яе атрымання, зніжэнне адміністрацыйнай нагрузкі на прадпрымальнікаў, умяшанне дзяржорганаў у гаспадарчую дзейнасць арганізацый.

Людміла КАНАНОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях, адзначыла, што ў Праграме дзейнасці ўрада да 2025 года знайшлі адлюстраванне механізмы павышэння заробкаў для нізкааплатных работнікаў, эфектыўнай занятасці насельніцтва (пашырэнне практыкі прымянення яе нестандартных формаў), перападрыхтоўкі кадраў. Адказваючы на пытанне, за кошт якіх сродкаў будзе рэалізоўвацца павышэнне заробкаў, Людміла Кананoвіч канстатавала: «Гэта складаны механізм, і пад яго будуць распрацоўвацца яшчэ ўказы і пастановы, але ўсё роўна гэта даходная частка бюджэту. І мы лічым, што за кошт таго будзе павелічэнне заробкаў».

Васіль ПАНАСЮК, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі, выказаў меркаванне, за кошт чаго можна дасягнуць дабрабыту, прадугледжанага праграмай.

«Калі стаіць пытанне па павышэнні эфектыўнасці прамысловасці, вытворчай сферы, неабходна звянуць увагу, што прадугледжана (павышэнне — **«Зв».**) ВУП, энергаёмістасці, інавацыйнасці, паляпшэнне кіравання прамысловым сектарам эканомікі, павелічэнне аддачы ад выкарыстання дзяржаўнай маёмасці», — сказаў дэпутат.

Нерухомасць

КАМЕРЦЫЙНАЕ ЖЫЛЛЁ ДЛЯ МІНЧАН І НЕ ТОЛЬКІ

У пасёлку Мачулішчы пачалі будаваць вялікі жылы комплекс выключна не для льготнікаў

У Мінскім раёне днямі пачалі будаўніцтва комплексу «Сакаліны край», які будзе складацца з больш чым двух дзясяткаў дамоў. Новы жылы комплекс размесціцца па суседстве з заказнікам «Сакаліны» ў гарадскім пасёлку Мачулішчы прыкладна за 15 кіламетраў ад Мінска.

Па праекце тут з'явіцца 21 жылы дом (кожны на пяць паверхаў), дзіцячы сад на 230 месцаў і два вялікія гандлёвыя цэнтры на 3000 і 1000 квадратных метраў адпаведна. Цяпер будаўнікі прыступілі да ўзвядзення першай чаргі, якая складаецца з двух пяціпавярховых дамоў на 127 і 64 кватэры адпаведна. Кватэры ў першых дамах з'явяцца ў продажы ўжо ў пачатку наступнага года. Арыенціровачны кошт квадратнага метра агульнай плошчы кватэр будзе стартаваць ад 750 долараў. Пры гэтым жыллё мяркуецца рэалізоўваць толькі на камерцыйнай аснове.

Купіць кватэру ў новабудоўлі можна будзе любой планіроўкі: ад маленькіх кватэр-студый да трохпакаёвых апартаментаў з кухняй-гасцёўняй. Рэалізацыя ўсяго праекта разлічана на пяць гадоў. Аднак, па словах падрадчыка, многае залежыць ад наяўнасці крэдытавання нерухомасці і пакупніцкай актыўнасці. Усяго запланавана каля 10 чэргаў будаўніцтва. Да ўзвядзення гандлёвых цэнтраў кампанія прыступіць прыкладна ў 6–7 чарзе будаўніцтва, тады ж будзе пабудаваны і дзіцячы сад. Пры гэтым стаянку для аўтамабіляў арганізуюць адразу.

Сяргей КУРКАЧ.

Без бар'ераў

ЧАС ДЛЯ ТВОРЧАСЦІ

Пазнаёміцца з творчасцю людзей з абмежаванымі магчымасцямі можна на выстаўцы «Мой свет у фарбах», якая сёння адкрываецца ў Палацы Рэспублікі.

Праект арганізаваны камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінаблвыканкама разам з мастацкай галерэяй «Універсітэт культуры». У экспазіцыі пададзены работы творцаў з установ сацыяльнага абслугоўвання Міншчыны. Работы выкананыя ў розных тэхніках — акварэль, алейны і акрылавы жывапіс, гуаш, пастэль, алмазная вышыўка і іншыя.

Дарэчы, у Мінскай вобласці на базе 23 тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва працуе 25 аддзяленняў дзённага знаходжання інвалідаў, якія наведвае 770 чалавек. На сёння тут працуе больш за дзве сотні гурткоў (клубаў па інтарэсах). Кірункі разнастайныя: дэкаратыўна-прыкладная творчасць, мастацтва, тэатральны, харавы і танцавальныя кірункі.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне Сіткевіч Таццяне Анатолеўне, кансультанту інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення Міністэрства інфармацыі, у сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю МАЦІ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Інтэрпол папярэдзіў пра небяспеку з'яўлення фальшывых COVID-вакцын

Інтэрпол занепакоены магчымай пагрозай з боку арганізаванай злачыннасці ў свеце, якая можа планаваць распаўсюджваць падробленыя вакцыны ад каранавіруса COVID-19 або красці сапраўдныя, паведаміла The Guardian. «Вельмі важна, каб органы правапарадку былі як мага лепш падрыхтаваныя да лавіны ўсіх відаў крымінальнай актыўнасці, звязанай з вакцынамі супраць COVID-19», — заявіў генеральны сакратар Інтэрпола Юрген Шток. У сувязі з гэтай небяспекай, адзначае The Guardian, Інтэрпол разаслаў адпаведныя папярэджанні ў праваахоўныя органы 194 краін — членаў арганізацыі. У сваю чаргу Шток адзначыў, што крыміналітэт «плануе ўкараніцца ў ланцужкі паставак (прэпаратаў. — **Рэд.**) або сарваць іх», а таксама ўводзіць грамадзян у зман пры дапамозе фальшывых сайтаў, прапаноўваць ім падробленыя лекі, «якія могуць уяўляць істотную рызыку для здароўя, нават для жыцця». Ён адзначыў, што злачынцы маюць намер узмацніць актыўнасць у дачыненні да «фальсіфікацыі, крадзяжу або нелегальнай рэкламы вакцын ад COVID-19».

Кітайскі касмічны апарат сабраў першую партыю грунту на Месяцы

Пасадачны модуль кітайскай аўтаматычнай станцыі «Чан'э-5», паспяхова прабурыў грунт Месяца на глыбіню два метры, падняў узоры геалагічнай пароды і запакаваў іх у кантэйнер для адпраўкі на Зямлю, паведаміла Нацыянальнае касмічнае ўпраўленне Кітая (CNSA). Модулю яшчэ трэба будзе з дапамогай рукі-маніпулятара сабраць узоры грунту з паверхні Месяца. Як паведамляла кітайскае касмічнае агенцтва, у аўторак пасадачны модуль з узлётным апаратам здзейсніў паспяховае мяккае прылуненне. Пасадка адбылася ў 18:00 па мінскім часе ў раёне піка Румкера ў Акіяне Бур у заходняй частцы бачнага боку Месяца. У рамках місіі пасля пасадкі на Месяц модуль павінен сабраць каля двух кілаграмаў геалагічнай пароды. На ўсю аперацыю па зборы грунту адведзена 48 гадзін.

Эйфелеву вежу адкрыюць для наведвання з 16 снежня

Закрытая восенню ў рамках мер па барацьбе з распаўсюджваннем каранавіруса Эйфелева вежа ў Парыжы адновіць работу з сярэдзіны снежня. Аб гэтым паведамляецца на сайце кампаніі, якая адказвае за эксплуатацыю збудавання. З 16 снежня вежа будзе адкрыта для наведвання з 10.30 да 18.30. Пры гэтым паведамляецца, што будуць дзейнічаць дадатковыя меры бяспекі ва ўмовах пандэміі — абавязковае нашэнне маскі, абмежаванне па колькасці наведвальнікаў і штодзённая дэзынфекцыя. Як вядома, у Францыі з 15 снежня ў рамках другога этапу змякчэння абмежаванняў адновяць работу музеі і аб'екты культуры пры захаванні строгіх санітарна-эпідэміялагічных мер.

КАВУНЫ ПА-БЕЛАРУСКУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Для захавання кавуноў у нашы дні актыўна выкарыстоўваюцца фунгіцыды, якія змагаюцца з гнілямі, — тлумачыць Мечыслаў Сцяпура. — Трапляючы на плод, малекула такога прэпарату на працягу пяці—дзесяці хвілін забівае ўвесь міцэлій. Апрацаваныя гэтым сродкам кавуны захоўваюцца па паўгода. Іх можна кідаць, трэсці, не вытрымліваць тэмпературу захоўвання — гніць яны не будуць. Бяда толькі ў тым, што такія хімічныя прэпараты небяспечныя для чалавека. Іх малекулы ўжыўляюцца ў скурку плода і не вымываюцца вадой. Былі выпадкі атручэння людзей такімі апрацаванымі кавунамі, набытымі на трасе і нават у гіпермаркетах.

— Такім чынам, экалагічна чысты кавун можна вырасціць толькі самастойна?

— На жаль, тыя, што вязуць здалёк, — адназначна апрацаваныя «хіміяй». Мне не раз задавалі пытанне, як захаваць кавуны без выкарыстання фунгіцыдаў. Але, на жаль, без «штукарства» кавун захоўваецца толькі месяц, максімум — паўтара. Як і дыня. Высокае ўтрыманне цукроў — добры фон для размнажэння гніласных бактэрый. Каб расцягнуць тэрмін захоўвання на два месяцы, можна захоўваць іх пры 0 градусаў, у моху, пяску, гліне. Але паўгода ў экалагічна чыстых умовах кавун у вас не праляжыць.

— Ці ёсць сэнс, напрыклад, для дачнікаў, вырошчваць беларускія кавуны?

— Безумоўна. Кавун у Беларусі вырасціць лягчэй, чым агурок. Вырошчваюць яго, дарэчы, таксама праз расаду. Проста беларусы не прывыклі да гэтай культуры, і людзі баяцца, што нічога не атрымаецца. Але клімат у тым жа Растове-на-Доне — рэзка кантынентальны: днём тэмпература падымаецца да 40 градусаў, а ўначы холадна. І расліна вытрымлівае такія перапады. У нас такіх ваганняў няма, клімат мяккі. А галоўнае — для гэтай культуры ў нас падыходзяць глебы. Кавуну патрэбныя паветрапранікальныя глебы. У Беларусі такіх глеб шмат — на 70 % гэта супесак, рыхлы супесак, лёгкі суглінак. Расце кавун ва ўсіх абласцях нашай краіны, у тым ліку на Віцебшчыне, толькі трэба выконваць тэхналогію.

Галандскія кавуны для беларускіх дачнікаў

Для нашай кліматычнай зоны асаблівае значэнне мае колькасць дзён ад завязвання да поўнага паспявання пладоў — і дзён гэтых павінна быць як мага менш, бо цёплы сезон у параўнанні з паўднёвымі краінамі ў нас кароткі. Усё ж бахчавыя культуры для нас нязвыклыя, і айчынныя селекцыянеры вывядзеннем іх новых сартоў асабліва не займаюцца. У беларускіх умовах раяніраваны (ўсебакова выпрабаваны і рэкамендаваны для вырошчвання) расійскі сорт «Огонек». Сярод апошніх распрацовак — уласна беларускі сорт кавуна «Сцяпурскі»: ён названы ў гонар свайго стваральніка і пакуль не прадстаўлены ў дзяржаўную камісію па сортавыпрабаванні.

— Па сутнасці, гэта палепшаны варыянт «Огонька», — тлумачыць суразмоўца. — Ён таксама мае цёмна-зялёную афарбоўку, але калі «Огонек» дае плод па паўтара-два кілаграмы, наш новы сорт — гэта кавуны вагой па шэсць кілаграмаў.

На эксперыментальных участках навукоўцы займаюцца таксама вырошчваннем галандскіх гібрыдных сартоў кавуноў — «Раманза», «Топган», «Бедуін».

— Расійскімі сартамі мы не займаемся, — расказвае Мечыслаў Францавіч. — Як адзначае акадэмік Піваваравў, расійскія сарты і гібрыды могуць рэалізаваць свой патэнцыял да 44-й шыраты. Беларусь размешчана на 52-й шыраце, Галандыя — на 50-51-й. Там кліматычныя ўмовы бліжэй да нашых. Мы спрабавалі расійскія сарты — яны нядрэнна растуць у Беларусі, але не паспяваюць выспець.

— А як вырошчваць кавуны ў Беларусі? У цяпліцах?

— Можна ў цяпліцах, а прасцей — у адкрытым грунце. Галоўнае — праз расаду. У Расіі кавуны

Фермеры расказваюць: пакуль не прададуць беларускія кавуны, прывазныя людзі не купляюць. У кавунах, якія прывозяць здалёк, толькі 6 % цукру, бо іх ірвуць недаспелымі. А ў нашых — мінімум 8 %.

вырошчваюць з насення — сеюць проста ў грунт. Але там не шкадуюць пасяўны матэрыял, бо ён танны. А галандскае насенне — 1000 семечак — каштуе 40 еўра. Таму падыходзіць да пытання трэба далікатна.

«Меншыя браты»

Галоўная праблема, з якой сутыкаюцца агароднікі пры вырошчванні бахчавых культур у нашых шыротах, — не капрызы надвор'я і не позніе замаразкі. Галоўны вораг ураджаю кавуноў — гэта насякомыя. Каранёвая сістэма кавуноў салодкая. Калі вы пасееце насенне, то «меншыя браты» — мядзведкі, драцянікі, лічынкі хрушчоў — не дадуць «нованароджаным» карэньчыкам шанцу адужаць. Таму кавуны ў нас трэба вырошчваць толькі праз расаду, каб пасадзіць расліны ў грунт ужо з добра развітой каранёвай сістэмай. Хоць і яе таксама паспяхова аб'ядаюць.

— Часам мне тэлефануюць агароднікі-аматары: «Што вы нас падманваеце? Не растуць кавуны ў Беларусі! Я ўсё зрабіў правільна, а яны не растуць», — расказвае Мечыслаў Сцяпура. — Тады я раю вырваць з зямлі адну расліну. І аказваецца, што яна лёгка дастаецца, таму што каранёў, па сутнасці, ужо няма — іх з'елі.

— Гэтая праблема — менавіта беларуская?

— Гэтая праблема цяпер паўсюль. Раней у зямлю актыўна ўносілі арганіку. У маёй маладосці ў Беларусі на гектар у сярэднім прыходзілася 33 тоны арганікі (і торф, і гной), а цяпер — каля шасці тон. Нямала гаспадарак, якія цалкам перайшлі на мінеральныя ўгнаенні. Як вынік, раней мікраарганізмы і насякомыя ператраўлялі салому, што змяшчаецца ў арганіцы, і такім чынам стваралі спрыяльнае асяроддзе для каранёў раслін, а цяпер — адразу накідваюцца непасрэдна на карані. Арганікі цяпер проста няма, нават у вёсках. Раней у кожнай вёсцы была стайня на 20—30 коней, кароўнік, хлеў для цялят. Кожны гаспадар на ўласным падворку трымаў карову, свіней, курэй, гусей, авечак. Цяпер людзям прасцей купіць мяса і малако ў гіпермаркеце.

— Што ж рабіць са шкоднікамі?

— Абараняць расліны. З дапамогай той жа хіміі — куды ж без яе?.. Але каб мінімізаваць яе ўплыў, лепш рабіць «калатушу» з гліны і гною, дадаваць туды ахоўныя прэпараты і ў гэтую сумесь абмакваць карані саджанцаў перад высадкай у грунт. Калі гліна падсохне, атрымаецца «глазур».

— А калі выкарыстоўваць народныя сродкі?

— Можна паспрабаваць попел — у 1960-я, калі я быў падлеткам, з яго дапамогай паўсюдна змагаліся з насякомымі-шкоднікамі. Але ў кожную пасадачную ямку трэба высыпаць дзве-тры шклянкі попелу. Попел — пастка для шкоднікаў, яны ў ёй задыхаюцца, але для гэтага пласт попелу павінен быць досыць тоўсты. І попел варта выкарыстоўваць прасеяны праз сіта. Але лепш усё ж прымяніць інсектыцыд.

— Але ж мы хацелі атрымаць экалагічна чысты прадукт...

— Ён і будзе экалагічна чысты — з папраўкай на сучасныя рэаліі. У Беларусі «хіміяй» палі апрацоўваюцца два-тры разы на сезон, у краінах Еўропы — у сярэднім 24 разы за такі ж перыяд. Так што еўрапейцы, прыязджаючы да нас, адзначаюць, што нашы агародніна і садавіна маюць непаўторны натуральны смак.

Стратэгія поспеху

Калі вы вырашылі вырасціць каля дома кавун — вось вам простая інструкцыя ад найлепшага ў краіне спецыяліста па бахчавых культурах.

• **Купляем насенне.** Цяпер — найлепшы час для гэтага. Сарты — галандскія гібрыды (бяспройгрышны варыянт, усходжасць — 98 %) або праверaны «Огонек».

— Толькі не купляйце насенне кавуна на базары: можаце нарвацца на сорт з вялікім перыядам вегетацыі. Для Беларусі патрэбны тэрмін ад пасадкі на расаду да выспявання плода не больш за 75 дзён (а лепш — 72 дні). Але з Расіі да нас прывозяць насенне кавуна з тэрмінам выспявання 80-90 сутак. Атрымаць ураджай такіх сартоў у нас немагчыма.

• **На расаду насенне саджаем 15 красавіка.** На Віцебшчыне — зрушваем тэрміны дзён на пяць. У збанкі набіваем намочаны вадой торф з разліку 0,5 л торфу на адно семечка. Насенне папярэдне замочваюць у марлі на 6-8 гадзін. Прарошчваць расаду варта на паўднёвым акне пры тэмпературы 24—28 градусаў.

— Ні ў якім разе не бярыце торф чорнага колеру. У яго вялікая шчыльнасць, і ў ім гіне практычна любое насенне, асабліва — гарбузовых культур.

• **Высаджваем расаду ў адкрыты грунт пасля 20 мая.** У кожную лунку дадаём попел, а карані акунаем у гліняную «калатушу» з інсектыцыдам. Трымаем пасадкі пад плёнкай да 15 чэрвеня.

• **Плёнку прыбіраем,** расткі раскладваем па зямлі і прымацоўваем — каб іх не скруціў вецер і каб яны таксама далі карэньчыкі: расліна атрымае дадатковае харчаванне.

• **Астатняе проста:** паліў, праполка. Ураджай збіраем з 5 да 15 жніўня!

— Дарэчы, можна вырошчваць у нас і дыні (таксама галандскай селекцыі) — гэтую культуру лепш высаджваць у цяпліцу. Тут ёсць адна хітрасць, якая гарантуе ўраджай. У маладой расліны падвязваюць цэнтральнае сцябло. Калі на ім з'явіцца пяты ліст, абразаем верхавіну. З пазух лісця з'явяцца парасткі. Пакідаем два з пяці, і таксама абразаем верхавіну кожнага парастка пасля таго, як на іх вырасце па шэсць лісцікаў. Тады з гэтых парасткаў з'явяцца наступныя, на якіх і будзе цвіценне па жаночым тыпе і плоданашэнне. Калі вы гэта не зробіце, пладоў можна не дачакацца — атрымаеце толькі зялёную масу.

Можна вырошчваць на прысядзібным участку і дыні, сцвярджаюць навукоўцы. Галоўнае — вытрымліваць тэхналогію.

Кавуны замест агуркоў?

Як расказаў навуковец, бахчавыя культуры паступова заваёўваюць нашы палі і прысядзібныя соткі.

— Кавунамі ўжо займаюцца многія. Узяць хоць бы Маларыцкі раён — там цэлыя вёскі вырошчваюць кавуны. Па Мінскай вобласці — у Смалявічах ёсць даволі вядомы ў краіне фермер, Уладзімір Аляксандравіч Крапіўка, ён таксама вырошчвае кавуны. Ёсць фермеры і проста аматары, якія займаюцца кавунамі ў Століне, Слуцку, Рэчыцы, нават на Віцебшчыне. Яны расказваюць: пакуль беларускія кавуны не прададуць, прывазныя людзі не купляюць. Таму што нашы, «толькі з градкі» — маюць зусім іншы смак. Астрахань ад Беларусі — за тысячы кіламетраў. Каб прывезці адтуль кавун, яго рвуць недаспелым. І таму ў кавунах, якія сюды прывозяць здалёк, толькі 6 % цукру. А ў нашых, беларускіх — мінімум 8 %.

Нават на Піншчыне, у самым агурочным рэгіёне краіны, некаторыя гаспадаркі пераходзяць з агуркоў на кавуны, гаворыць Мечыслаў Францавіч.

— З аднаго боку, агуркі пачалі хварэць нематодай — занадта доўга іх саджалі на адным і тым жа месцы, — тлумачыць суразмоўнік. — З другога — на мяжы з Беларуссю, на Смаленшчыне, расіяне пабудавалі 400 га цяпліц, і з-за аб'ёмаў сабекошт агародніны там ніжэйшы, чым у нас. Так што многія гаспадаркі пераходзяць з традыцыйных агуркоў-памідораў на іншыя культуры — ягады (у першую чаргу суніцы, тыя ж кавуны), кветкі.

А вось нязвыклыя для беларускага агародніка віды агародніны: селекцыянеры вырасцілі для нашых умоў і айчынныя сарты цыбулі-парэю, і брокалі, і кальрабі, і савойскай капусты — але пакуль не сустрэлі разумення ні ў дачнікаў, ні ў фермераў. Затое палюбіўся народу сорт салодкага перцу «Парнас», які пераўзыходзіць па ўраджайнасці нават галандскія сарты.

— Нашаму «Парнасу» ўжо каля пяці гадоў. Цяпер яго вырошчваюць фермеры, дачнікі, вяскоўцы. Ён залаціста-жоўты, таўшчыня сценкі — 7-8 мм, у ім шмат цукроў і больш за 150 мг вітаміну С. Маса аднаго плода даходзіць да 400 г: у сярэднім на кілаграм — тры перцы. «Парнас» падыходзіць і для свежых салатаў, і для кансервавання. Многія дзякуюць мне за гэты сорт, — усміхаецца суразмоўнік. — Неяк патэлефанавала пажылая дама і кажа: «Дзякуй, што навучылі мяне перац есці». Аказалася, да таго, як пасадзіць наш сорт, яна цярпець не магла гэтую агародніну. Пасадзіла не для сябе — для сваіх дамашніх. Але пакаштавала наш «Парнас» — і палюбіла гэты смак.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Сямейная газета

Выпуск № 22 (158)

ДЗЕЦІ — ГЭТА І ЁСЦЬ ЖЫЦЦЁ

Дзесьці даводзілася чуць такое: «Я з гэтымі дзецьмі жыць не паспяваю». Што мелася на ўвазе, сказаць цяжка, як і ўдакладніць, колькі ў той жанчыны дзяцей...

Са з'яўленнем Цёміка шмат чаго не паспявала і я. Першыя месяцы нават не было калі паесці. Але хутка важныя справы сталі другараднымі, і я прызвычаілася жыць у новым тэмпе, у рэжыме маленькага чалавечка.

Відаць, тая жанчына, якая «не паспявае жыць разам з дзецьмі», папросту не можа займацца тым, чым хоча. Не можа ў выхадны дзень, як раней, даўжэй паваляцца ў ложку, бо нехта маленькі не паспее расплюшчыць вочкі, як пачынае крычаць: «Адзявай мяне!» або «Давай у трактары гуляць». Не можа спакойна паляжаць у цёплай ванне, бо да яе абавязкова павінен далучыцца і маленькі купальшчык. Не можа ў цішыні паглядзець любімы серыял і папіць кавы з цукеркай, бо раптам каналы пачынаюць пераключацца — нехта ў пошуку мульцікаў, а на салодкае ёсць яшчэ як мінімум адзін прэтэндэнт, якому цукеркі выдаюцца ў абмежаванай колькасці. Не можа часам пагаварыць па тэлефоне, бо некаму абавязкова трэба прадэманстраваць свае маўленчыя здольнасці...

Але гэта ўсё дробязі. З нараджэннем майго Арцёмкі жыццё заззяла новымі фарбамі, каштоўнасці сталі зусім іншыя. Ніколі раней не даводзілася столькі часу праводзіць на вуліцы. Ідзе дождж — ёсць парасон, у моцную спёку выручае сонцаахоўны крэм, ад ветру ратуе капюшон — у любое надвор'е, за рэдкім выключэннем, мы дыхаем свежым паветрам, а разам з тым сузіраем прыроднае харство. Ці не гэта жыццё?!

Толькі дзякуючы дзецям мы радуемся першаму снегу, зорачкам на небе, кату, які прыбіўся да пад'езда. З такім жа імпэтам, як гэтыя малыя энерджайзеры, шукаем на кары дрэў жукоў-пажарнікаў, а ў траве — белыя аблачынкі дзьмухаўцоў. З задавальненнем збіраем букеты з пустазелля і нават не супраць пакачацца са сваім малым у кучы лісця, якую не так даўно зладзіў дворнік. Праходзім каля дрэў у позе «зю» ў пошуках каштанаў і жалудоў, а ў цёплы летні дажджлівы дзень хутчэй бяжым на вуліцу, каб калі не прайсціся па лужынах (бо што пра мяне могуць падумаць!), а хоць бы пакідаць туды каменьчыкі — і пажадана вялікія, бо Цёмік ад смеху ажно заліваецца. Гэта і ёсць жыццё! Самае сапраўднае!

А якая раскоша, нікуды не спяшаючыся, прысесці каля тэлевізара. І няхай гэта будуць мульцікі, якія да нараджэння Цёміка, прызнацца, глядзела толькі ў сваім дзяцінстве. Найвялікшае задавальненне — патрымаць у руках кнігу. Так шмат я чытала толькі тады, калі вучылася на журфаку. І ўсё гэта дзякуючы малому, які палюбіў кнігі з дзевяці месяцаў. Сёння яму два з паловай, і за гэты час прачытаны ўсе зборнікі казак (беларускія, рускія, народаў свету), якія я толькі магла адшукаць у даволі нядрэннай хатняй бібліятэцы сваіх бацькоў. Цяпер мы чытаем «Чараўніка Смарагдавага горада», пятую аповесць са знакамітай казкі Волкава. Вядома, мае чытацкія патрэбы не абмяжоўваюцца дзіцячай літаратурай. У нашай сельскай бібліятэцы даўно не было такога актыўнага чытача. Ці не гэта жыццё — займацца тым, што любіш?!

Адным словам, з дзецьмі якраз наадварот, яшчэ як паспяваеш жыць! Сапраўднае жыццё — зусім побач. Яно ў дробязях. Ва ўсмешцы маленькага чалавека. У мыльных бурбалках, якія пад звонкі смех лопаюцца ў паветры. У першых сняжынках, якія трымаеш на сваёй далоні.

Вераніка КАНЮТА.

Сяргей МІНІН:

«Я НЕ РАБЛЮ З ДЗЯЦЕЙ ЧЭМПІЁНАЎ»

Сакрэты здаровых адносін са спортам ад бацькі і трэнера

Для Сяргея Мініна спорт — не прафесія, а спосаб жыцця. На рабоце ён — галоўны трэнер нацыянальнай зборнай па канькабежным спорце, кіраўнік уласнай ролер-школы, а дома — бацька чатырох дзяцей, муж знакамітай фрыстайлісткі, удзельніцы Алімпійскіх гульняў Асоль СЛІВЕЦ. У Сяргея і Асоль нават не стаяла пытанне, будуць займацца іх дзеці спортам ці не. Чацвёра малодшых Мініных, як і бацькі, з малых гадоў ведаюць пра трэніроўкі і спаборніцтвы. Шматдзетны бацька падзяліўся сакрэтамі выхавання спартыўных, шчаслівых і ўсебакова развітых дзяцей.

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

ДАЙЦЕ ШЧАСЦЮ ДРУГІ ШАНЦ,

або У мамы з'явіўся новы сябар

Пачаць новыя адносіны любому чалавеку бывае няпроста. А калі ты адзінокая маці з дзецьмі, то ўсё яшчэ больш ускладняецца. Бо выбар робіш для сябе, але разам з тым і для сваёй сям'і. Ад таго, як складуцца адносіны паміж усімі, будзе залежыць і шчасце і, як кажуць, надвор'е ў доме.



Першае ўражанне — не вынік

Калі вы прынялі рашэнне арганізаваць сустрэчу свайго новага спадарожніка і вашага дзіцяці, то падумайце, ці дастаткова было ў вас і ў сына ці дачкі часу, каб справіцца з прыняццем той сітуацыі, што бацькі больш не разам. Бо развод альбо расставанне маці і бацькі для дзяцей — гэта заўсёды стрэс. Важна знаёміць двух дарагіх вам людзей не спяшаючыся, каб даць ім час разгледзець адно аднаго. Тады гэта будзе максімальна бяспечна для кожнага боку.

— Часам бывае так, што жанчына пасля разводу, не прайшоўшы стадыю перажывання, уступае ў новыя адносіны. Але тут трэба разумець, што і дзеці страцілі блізкага чалавека. І калі раптам вашы новыя адносіны акажуцца несур'ёзнымі, дзіця будзе кожны раз пры гэтым перажываць разрыў, як і пасля расставання бацькоў. Таму жанчыне варта знаёміць свайго мужчыну з дзецьмі толькі тады, калі яна ўпэўненая ў сур'ёзнасці намераў новага выбранніка, — кажа **псіхолаг Вера ПРОХАРЧЫК.** — Лепш, каб прайшоў рамантычны перыяд (ад 6 да 9 месяцаў дакладна), а там, як будзе разуменне, што гэтага мужчыну жанчына хоча бачыць у сваім доме і побач са сваімі дзецьмі, то можна пазнаёміць іх.

(Заканчэнне на 8-й стар. «СГ».)

І ЎСЁ Ж ГЭТА ДЗЕЦІ

Непаўналетнія ў крымінальным працэсе: практычныя нюансы

Прыцягненне непаўналетніх да крымінальнай адказнасці вызначаецца як агульнымі правіламі, што прадугледжаны Крымінальна-працэсуальным кодэксам краіны (КПК), так і дадатковымі гарантыямі, якія вызначаны ў главе 45 КПК. Органы крымінальнага пераследу пры гэтым павінны даказваць дадатковыя абставіны справы. Увогуле, ад таго, наколькі поўна абаронены правы і інтарэсы падлетка на пачатковых стадыях крымінальнага працэсу, залежыць, па сутнасці, далейшы працяг крымінальнай справы і лёс самога непаўналетняга. Пра асаблівасці абароны правоў дзяцей-правапарушальнікаў (затрыманне, прымяненне мер стрымлівання, следчыя дзеянні) расказалі эксперты падчас аднаго з вэбінараў, якія сумесна з Рэспубліканскай калегіяй адвакатаў Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЕФ) у Беларусі арганізаваў яшчэ летам. Разгледжаныя тут пытанні захавалі актуальнасць і сёння.

Узрост, інтэлект, умовы жыцця

Нягледзячы на тое што ў Беларусі няма самастойнай сістэмы ювенальнай юстыцыі, у нацыянальным заканадаўстве рэалізаваны спецыяльныя міжнародныя патрабаванні, якія замацаваны ў мінімальных стандартных правілах ААН, што датычацца здзяйснення правасуддзя ў дачыненні да непаўналетніх, заўважыла **Вольга БАРАНЧЫК, адвакат Мінскай абласной юрыдычнай кансультацыі № 1:**

— Згодна з гэтымі правіламі, сістэма правасуддзя ў дачыненні да непаўналетніх скіравана найперш на забеспячэнне дабрабыту падлетка і на тое, каб любыя меры ўздзеяння на непаўналетняга правапарушальніка былі заўжды суразмерныя як з асаблівасцямі асобы парушальніка, так і з абставінамі самога правапарушэння ці злачынства.

Каб вызначыць меру стрымлівання затрыманага непаўналетняга, яго павінен дапытаць асабіста пракурор ці яго намеснік, старшыня Следчага камітэта, старшыня Камітэта дзяржбяспекі або асобы, якія выконваюць іх абавязкі.

Непаўналетні, як і дарослы, мае права не даваць паказанняў ці тлумачэнняў пасля фактычнага затрымання без прысутнасці законнага прадстаўніка ці абаронцы. Пры гэтым права непаўналетняга на званок не замацавана ў ПКП, аднак органы крымінальнага пераследу абавязаны паведаміць аб затрыманні падлетка яго прадстаўнікам.

гады — нацыянальная канцэпцыя ўдасканалення юстыцыі для непаўналетніх, якой у многіх краінах яшчэ няма. Робіцца шмат.

Крымінальным кодэксам прадугледжаны абавязак органаў крымінальнага пераследу па справах аб злачынствах непаўналетніх даказваць дадатковыя абставіны паралельна з іншымі абставінамі, якія выяўляюцца па агульных правілах КПК. Найперш **органы павінны даказаць узрост непаўналетняга** (дату, месяц і год нараджэння). Гэта робіцца, таму што не заўсёды ўзрост падлетка адпавядае яго ўзроўню інтэлектуальнага і псіхалагічнага развіцця. Як дадатковыя абставіны **павінны быць даказаны ўмовы жыцця і выхавання непаўналетняга, ступень інтэлектуальнага, валявога і псіхічнага развіцця, наяўнасць дарослых падбухторшчыкаў і іншых саўдзельнікаў.**

Рашэд Мустафа САРВАР, прадстаўнік дзіцячага фонду ЮНІСЕФ (на момант правядзення вэбінара — **«Зв.»),** які на працягу пяці гадоў (са снежня 2015 па ліпень 2020) займаўся ў Беларусі праблемай злачыннасці непаўналетніх, падкрэсліў:

— Як правіла, з пачатку крымінальнай справы бацькі не вельмі ведаюць, як абараняць сябе і малога. Але ж падчас фарміравання доказнай базы, калі дзіця і яго бацькі пачнуць разумець, як адстойваць інтарэсы непаўналетняга, гэта ўжо забяспечыць палову поспеху ў абароне правоў дзіцяці. Беларусь — адна з самых паспяховых краін, дзе мы працавалі з падлеткамі. Адно з нашых дасягненняў за два

Збор гэтай інфармацыі праводзіцца шляхам запатрабавання адпаведных дакументаў, накшталт даведкі з месца жыхарства ці работы, характарыстыкі, актаў абследавання жыллёвых і бытавых умоў і іншых. А таксама ў ходзе допыту непаўналетніх абвінавачваных ці падазроных, або сведак ці пацярпелых. У пэўных выпадках для ўстанаўлення гэтых звестак можа быць прызначана і праведзена экспертыза ці іншыя следчыя і працэсуальныя дзеянні, удакладніла адвакат:

— Каб высветліць абставіны, якія характарызуюць асобу, могуць быць дапытаны прадстаўнікі камісій, інспекцый па справах непаўналетніх, спецыялісты навучальных установ, працоўных калектываў. Устанаўленне ўмоў жыцця, выхавання і іншых абставін дазваляе ў далейшым не толькі правільна вырашыць пытанне аб прыцягненні да крымінальнай адказнасці, але і абраць меру ўздзеяння ў дачыненні да непаўналетняга, якая будзе найбольш эфектыўная.

Працэсуальныя гарантыі

Пры разглядзе спраў непаўналетніх прысутнічаюць працэсуальныя гарантыі, сярод якіх важны, напрыклад, прынцып двайнога прадстаўніцтва. Гэта значыць, што разам з непаўналетнім абвінавачаным ва ўсіх следчых і працэсуальных дзеяннях прысутнічае яго законны прадстаўнік і абаронца. Больш за тое, калі ў падлетка ёсць бацькі ці іншыя законныя прадстаўнікі, іх удзел у крымінальнай справе абавязковы.

— Законны прадстаўнік дапускаецца да ўдзелу ў справе па пастанове следчага з моманту першага допыту непаўналетняга ў якасці падазронага ці абвінавачванага. Пры гэтым законныя прадстаўнікі не заўжды могуць належным чынам абараняць інтарэсы падлетка. Гэта можа выражацца ў ігнараванні працэсуальных абавязкаў, якія прадугледжаны законам, або ў ціску на непаўналетняга і парушэнні парадку падчас следчых дзеянняў, — заўважыла Вольга Баранчык. — *Часам нават простая прысутнасць законнага прадстаўніка можа псіхалагічна абмежаваць непаўналетняга ў нейкіх выказваннях, у тым ліку прывесці да адмовы ад паказанняў. Негатыўныя адносіны з бацькамі ў сям'і, боязь пакарання з іх боку могуць скаваць падлетка. І калі будзе ўстаноўлена, што прыстунасць законнага прадстаўніка наносіць шкоду інтарэсам непаўналетняга падазронага, першага могуць адхіліць ад удзелу ў крымінальнай справе. Няяўка прадстаўніка на якую-небудзь працэдуру справы не перашкаджае яе правядзенню, калі ёсць пісьмовая згода абвінавачванага. Аднак на працэсе абавязкова будзе прысутнічаць педагог ці псіхолаг і абаронца.*

Прысутнасць адваката абавязковая, незалежна ад таго, што падлетак мог стаць паўналетнім да пачатку судовага разбору. Калі ж гэтыя правы непаўналетняга не забяспечаны — то гэта лічыцца парушэнем закона, што павінна пацягнуць за сабой безумоўную адмену прысуду. Калі працэс адбыўся без абаронцы ці педагога-псіхолага, то следчае дзеянне будзе лічыцца незаконным, а яго пратаколы не могуць быць пакладзены ў аснову абвінаваўчага прысуду.

Інфармацыя, якую падлетак даў без прысутнасці абаронцы ці законнага прадстаўніка, не мае юрыдычнай сілы. Гэтыя звесткі нельга выкарыстоўваць для доказаў.

Затрыманне падлетка не можа доўжыцца без пэўных дакументаў і абгрунтаванняў больш за тры гадзіны.

Допыт непаўналетняга не можа цягнуцца без перапынку больш за дзве гадзіны, а ў агульнай колькасці — звыш чатырох гадзін у дзень. Калі тэрмін перавышаецца, гэта можна разглядаць як спосаб псіхалагічнага ўплыву на падлетка. Ён можа стаміцца і, як вынік, пачаць нервавацца, блытацца, скажаць факты і гэтак далей.

Выклікаць падлетка, які не знаходзіцца пад вартай, як падазронага ці абвінавачванага ў суд ці да следчага нельга тэлефонным званком на яго нумар. Прадстаўнікі следчых органаў павінны зрабіць гэта праз яго бацькоў ці законных прадстаўнікоў, а не прымушаць падлетка з'явіцца адразу ж пасля званка.

Асаблівасці затрымання

Крымінальным кодэксам прадугледжаны такія моманты, як затрыманне і прымяненне мер стрымлівання ў дачыненні да непаўналетняга. Апошнімі, згодна з агульнымі нормамі для ўсіх асоб, з'яўляюцца: падпіска аб нявыездзе і належных паводзінах, асабістае паручыцельства, перадача асоб, на якіх распаўсюджваецца статус ваеннаслужачага, пад назіранне кіраўніцтва воінскай часткі, залог, хатні арышт. Для непаўналетняга гэта яшчэ і аддача пад нагляд бацькам, апекунам, папячыцелям, адміністрацыі дзіцячай установы, дзе знаходзіцца падлетак, ці іншым прадстаўнікам.

> Шмат злачынстваў датычацца незаконнага абарачэння наркотыкаў. За гэтае злачынства па артыкуле 328 прадугледжана ажно пяць частак пакарання, прычым санкцыі 3-й, 4-й і 5-й частак прадугледжваюць вялікія тэрміны і толькі з пазбаўленнем волі, у тым ліку і для непаўналетніх. А іх па гэтым артыкуле трапляецца вельмі шмат. Распаўсюджаны сярод падлеткаў таксама крадзяжы з дачных участкаў або тэлефонаў ці грошай з кішэняў у школе.

Пры гэтым дарослыя павінны напісаць хадайніцтва на аддачу і ўзяць на сябе адказнасць, што абвінавачаны не будзе хавацца ад суда, займацца злачынствамі і перашкаджаць следству. Калі непаўналетні парушыць пералічаныя ўмовы, пакараюць асобу, якая падала хадайніцтва на аддачу абвінавачанага. Аддача пад нагляд — гэта магчымасць непаўналетняга не трапіць у следчы ізалятар, дзе ўмовы не спрыяюць выпраўленню, яна мэтазгодная і правільная і выхоўвае ў тым ліку адказнасць у падлетка, які пры гэтым не выключаецца са звыклага асяроддзя, упэўнена адвакат. Самая цяжкая мера стрымання — зняволенне.

— Затрыманне непаўналетняга ўяўляе сабой фактычнае затрыманне асобы, дастаўленне яе ў орган крымінальнага пераследу і кароткачасовае зняволенне ў прадугледжаных законам месцах і ўмовах, — акрэсліла адвакат. *— Пры гэтым для падлеткаў затрыманне, зняволенне і хатні арышт павінны разглядацца як выключная мера, калі здзейсненае імі злачынства належыць да катэгорыі менш цяжкіх (прадугледжвае пакаранне тэрмінам не больш як шэсць гадоў), цяжкіх (магчыма зняволенне да 12 гадоў) ці асабліва цяжкіх (можа быць звыш 12 гадоў пазбаўлення волі).*

Затрыманне адбываецца па непасрэдным узнікненні падазрэння на здзейсненае злачынства, згодна з пастановай органаў крымінальнага пераследу або пастановай суда аб затрыманні ўжо асуджаных, якія парушаюць рэжым адбывання пакарання.

Ірына СІДАРОК.

ЮРЫДЫЧНЫ ЧАТ-БОТ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ І БАЦЬКОЎ

Пракансультавацца па пытаннях, якія закранаюць правы і законныя інтарэсы дзіцяці, цяпер можна праз чат-бот у Telegram @kids_lawyer_bot штодня з 17.00 да 19.00. Сэрвіс быў запушчаны Дзіцячым фондам ААН (ЮНІСЕФ) у Беларусі разам са спецыялістамі Беларускай рэспубліканскай калегіі адвакатаў у ліпені і працаваў толькі па два дні на тыдзень.

— Амаль адразу як запрацаваў чат-бот, мы ўпэўніліся, што ў Беларусі існуе патрэба ў такой дапамозе. За некалькі месяцаў колькасць зваротаў значна павялічылася. Падлеткі і іх бацькі цікавяцца самымі рознымі пытаннямі. Пачынаючы ад праблем выплаты аліментаў і сямейных адносін, заканчваючы пытаннямі крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці, — заўважыў **Дзмітрый ШЫЛІН, старшы кардынатар па пытаннях аховы дзяцінства дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Беларусі.** — Цяпер сэрвіс стане пастаянным, каб непаўналетнія і іх бацькі, якім патрэбны кансультацыі па пытаннях юрыдычнай адказнасці і шлюбна-сямейных адносін, маглі тэрмінова атрымаць дапамогу і даведацца, дзе знаходзіцца найбліжэйшы адвакат.

Урокі выхавання

ВА ЎСІМ ВІНАВАТАЯ МАТЫВАЦЫЯ,

або Як навучыць вучыцца

Як бы ні суцяшалі бацькі сябе тым, што адзнакі — не паказчык ведаў, практыка ўсё ж паказвае, што часцей на справе яны дэманструюць не толькі ўзровень ведаў, але і ўзровень матываванасці дзіцяці да развіцця. А што рабіць, калі ў яго няма жадання вучыцца? Ці калі жаданне з узростам знікла? Як наогул дапамагчы маленькаму чалавеку? На гэтыя пытанні адказала псіхолаг Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей Вольга МАСКАЛЕНКА.

— У дзяцей не бывае лянoты, — лічыць псіхолаг. — Да сямі гадоў у малых галоўным відам дзейнасці павінна быць гульня. Пасля сямі — вучоба, потым — работа. Калі дзіця легла на ложак і не хоча вучыцца, трэба разбірацца, што было да гэтага. Можа, бацькі перагрузілі гурткамі ці знік кантакт з роднымі... Бывае, што ў малога нешта не атрымліваецца ці ў яго праблемы з аднакласнікамі і настаўнікамі, а можа, павысілася па нейкіх прычынах трывожнасць. У такіх выпадках нельга адназначна сказаць, што менавіта здарылася. Можна паспрабаваць разабрацца самім бацькам, калі яны ў кантакце з дзіцем. Калі не, то лепш звярнуцца да псіхолагаў, якія дапамогуць разабрацца ў праблеме індывідуальна. У іншых выпадках трэба працаваць з матывацыяй.

Дзяцінства, на думку спецыяліста, доўжыцца да 25 гадоў. Да 12 гадоў — тыповае дзяцінства, якое характарызуецца фантазійным мысленнем. У гэтым узросце дзеці вераць у Дзеда Мароза ды феяў, і ім цяжка рэфлексаваць. Пасля ідзе падлеткавы перыяд, у гэтым узросце дзеці пачынаюць шуткаваць, падколваць дарослых, знікае вера ў казкі. Аднак падлеткавасць — гэта не пра дарасласць і прыняцце спелых рашэнняў. У 18 гадоў па пашпарце ў нашай краіне чалавек лічыцца дарослым, але на самай справе — гэта ўзрост больш дарослага падлетка. Толькі прыкладна да 23 гадоў чалавек пры добрых умовах развіцця і правільным пераадоленні ўзроставых крызісаў ужо навучыцца разумець, што ён адчувае, навучыцца выбудоўваць «дарослыя» межы і не парушаць чужых. У залежнасці ад таго, як праходзіць перыяд дзяцінства, могуць узнікаць праблемы з матывацыяй да вучобы і ўвогуле развіцця. Матывацыя можа быць унутраная і знешняя.

— Калі ў дзіцяці нешта добра атрымліваецца, то ўзнікае пачуццё задаволенасці сабой і сваёй дзейнасцю, — тлумачыць Вольга Маскаленка. — Гэта дазваляе нарадзіцца ўнутранай матывацыі, якая можа датычыцца і дзейнасці, і навучання. Напрыклад, у дзіцяці добра атрымалася спячы пячэнне. Яму хочацца рабіць гэта яшчэ, а потым і паэксперыментаваць у гэтым кірунку. Так спрацоўвае ўнутраная матывацыя і са школьнымі прадметамі. Такую матывацыю дарослым вельмі важна падтрымліваць і падмацоўваць, даваць ёй развіццё і ўдасканальваць.

Каб падтрымаць развіццё ўнутранай матывацыі ў дзіцяці, дарослым трэба стаць вельмі ўважлівымі назіральнікам. Нельга навязваць свае патрэбы дзецям. Прыкладна ў трохгадовым узросце ў дашкольніка здараецца першы ўзроставы крызіс. Ён пачынае аддзяляць сябе ад маці, адчувае, што яму не заўсёды хочацца рабіць тое, што яго просяць бацькі.

— Задача бацькоў — убачыць, што падабаецца рабіць малому, — лічыць псіхолаг. — І паспрабаваць тое развіць. Гэта можа быць спорт, музыка, маляванне, лепка, канструктар, робататэхніка ды ўсё, што заўгодна...

Знешняя ж матывацыя ўзнікае ўжо з дапамогай людзей і нейкіх вонкавых сітуацый. Гэта самая распаўсюджаная матывацыя ў нашых людзей. «Калі зараз не зраблю дамашняе заданне, то атрымаю двойку, а там і пакаранне ад бацькоў», — думае дзіця. І робіць часта не таму, што яму цікава, а каб двойку не атрымаць.

З такой матывацыяй адносіны ў дзяцей вельмі няпростыя. Прыклад з музычнай школай. Многія дзеці вельмі хочуць у яе паступіць, пачынаюць вучыцца і праз гады два ўжо мараць пакінуць гэтую ўстанову.

— Калі дзіця не ўлавіла «кайф» ад пераадолення цяжкасцяў і атрымання вынікаў, то так, хутчэй, і адбудзецца, — мяркуе спецыяліст. — Тут галоўнае для бацькоў — не перацяснуць! Захоча дзіця потым музыкай займацца, няхай займацца, калі падрасце і рашэнне будзе свядомае і ўнутрана матываванае. А дарослыя, калі вырашаюць, кінуць дзіцяці «музыкалку» ці не, таксама робяць выбар: заставацца бацькамі ў кантакце з дзіцем ці «націснуць» і страціць добрыя адносіны. Канешне, вучыць пераадольваць цяжкасці важна, але калі дарослы адчувае, што далей толькі «вайна», лепш адступіць. І паспрабаваць дзесяць кірункаў дзейнасці, але каб дзіця «гарэла» справай, а не давесці адно, але адбіць жаданне наогул спрабаваць нешта новае.

Пасля 12 гадоў знешняя матывацыя становіцца больш значная для падлетка, чым унутраная. Акружэнне і сябры аказваюць велізарны ўплыў на яго, таму бацькам так важна быць з дзіцем у кантакце і ствараць вакол яго пэўнае асяроддзе. Калі ж дзіця да 9 класа так і не вызначылася для сябе, чым хацела б займацца, можна падключыць да справы псіхолагаў-прафарыентолагаў. Яны дапамогуць знайсці «зоны адоранасці» дзіцяці, «уключыць» унутраную матывацыю.

— І наогул у чалавека ўсё жыццё напарадзе, — упэўнена спецыяліст. — Нармальна і ўжо дарослым мяняць прафесіі, здабываць новыя навыкі і спрабаваць рознае. Галоўнае, улавіць кантакт з патрэбай развівацца і атрымліваць ад гэтага стану асалоду.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Лайфхакі, якія настрояць на вучобу

РАБОЧАЕ МЕСЦА

Усе ведаюць пра тое, што святло павінна падаць збоку, а спіну трэба трымаць прама. Але на практыцы дарослыя самі часта чытаюць ці робяць працу лежачы. Дзеці робяць тое самае. І шмат губляюць, бо няправільна ўладкаванае рабочае месца зніжае эфектыўнасць.

Вылучыце дзіцяці асобнае месца для заняткаў — гэта дапаможа правесці мяжу паміж вучобай і ўсім астатнім. Перыядычна звяртайце ўвагу на тое, каб на стале быў парадак. Кацярына Ленгольд у кнізе «Проста космас» нагадвае: «Хаос на рабочым месцы абмяжоўвае здольнасць мозгу апрацоўваць інфармацыю. Беспарадак «загружае» мозг, ствараючы шум, які перашкаджае канцэнтравацца».

ПЛАНАВАННЕ

Адзін з галоўных навыкаў у вучобе — планаванне. Калі не дапамагчы дзіцяці авалодаць ім, то яно будзе дрэнна спраўляцца з заданнямі, не зможа ўкласціся ў тэрміны і нават можа страціць упэўненасць у сабе. Планаванне не патрабуе шмат часу, дастаткова адводзіць 10 хвілін на складанне штодзённага плана. Усталюйце ў тэлефоне або на камп'ютары напаміны аб ключавых датах і тэрмінах. Выбірайце зручны варыянт для вашага дзіцяці. Аднаму падыдзе раздрукоўка, іншаму — мабільнік.

САЧЫЦЕ ЗА АДПАЧЫНКАМ!

Часам тэмп жыцця дзіцяці ўражвае: школа, рэпетытары, курсы, секцыі... Ператамленне і выгаранне — пастка, якая чакае на шляху да поспеху загружанага малога. Таму абавязкова плануйце час для адпачынку і сачыце за рэжымам сну. Недахоп сну негатыўна адбіваецца на ўвазе, здольнасці да мэтанакіраванай дзейнасці, рабочай памяці, настроі, лагічным мысленні і нават на маторыцы. Ідэальная колькасць сну не вызначана, але ў сярэднім гэта 8 гадзін для дарослых і не менш як 9 гадзін для дзяцей.

Сацыяльная кансультацыя

РЭАЛЬНАЯ ДАПАМОГА

На якую падтрымку могуць разлічваць дзеці і моладзь?

«Раскажыце, калі ласка, пра меры сацыяльнай падтрымкі дзяцей і моладзі ў нашай краіне. Ад чаго яна залежыць і каго датычыцца?»

З павагай, сям'я Крывіцкіх,
г. Маладзечна.

Ільготы па аплаце харчавання дашкольнікаў

ПЛАТА НЕ СПАГАНЯЕЦЦА:

• з бацькоў (законных прадстаўнікоў) дзяцей-інвалідаў, дзяцей, якія пакутуюць на анкалагічныя захворванні, хворых на туберкулёз, інфіцыраваных вірусам імунадэфіцыту чалавека;

• з членаў сем'яў асоб, пералічаных у падпунктах 12.2 і 12.3 пункта 12 артыкула 3 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дзяржаўных сацыяльных ільготах, правах і гарантыях для асобных катэгорый грамадзян».

ПЛАТА ЗНІЖАЕЦЦА НА 50 ПРАЦЭНТАЎ:

• для сем'яў, якія маюць трох і больш дзяцей ва ўзросце да 18 гадоў;

• для сем'яў, якія пражываюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання ў зоне наступнага адсялення, у зоне з правам на адсяленне і ў зоне пражывання з перыядычным радыяцыйным кантролем;

• для апекуноў, прыёмных бацькоў, бацькоў-выхавальнікаў дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, дзіцячых вёсак (гарадкоў).

ПЛАТА ЗНІЖАЕЦЦА НА 30 ПРАЦЭНТАЎ:

• для сем'яў, якія маюць двух дзяцей, якія атрымліваюць дашкольную адукацыю, спецыяльную адукацыю на ўзроўні дашкольнай.

ІЛЬГОТЫ ДЛЯ НАВУЧЭНЦАЎ, ЯКІЯ АТРЫМЛІВАЮЦЬ АГУЛЬНУЮ СЯРЭДНЮЮ І СПЕЦЫЯЛЬНУЮ АДУКАЦЫЮ

• Бясплатнае харчаванне за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў для 13 катэгорый навучэнцаў, а таксама для чатырох катэгорый навучэнцаў за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, што выдзяляюцца на ліквідацыю наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, у залежнасці ад зоны радыеактыўнага забруджвання.

Акрамя таго, навучэнцы, што пастаянна (пераважна) пражываюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання і атрымліваюць дамашнюю адукацыю, бо па стане здароўя не могуць наведваць установы агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі, атрымліваюць кампенсацыю кошту харчавання.

• Частковае або поўнае вызваленне ад платы за падручнікі асобных катэгорый навучэнцаў.

У сістэме прафесійнай адукацыі прадугледжана

• Выпускнікам установ прафесійна-тэхнічнай адукацыі гарантуецца прапанова першага рабочага месца.

• Навучэнцам выплачваюцца навучальныя, сацыяльныя і спецыяльныя стыпендыі, а таксама імянныя стыпендыі за высокія вынікі ў вучобе і грамадскай рабоце.

• Навучэнцы ўстаноў, якія навучаюцца больш за адзін год, забяспечваюцца бясплатным аднаразовым гарачым харчаваннем; навучэнцы з малазабяспечаных сем'яў, а таксама іншагароднія навучэнцы ўстаноў, размешчаных у сельскіх населеных пунктах і рабочых пасёлках, — бясплатным трохразовым харчаваннем у навучальныя дні.

• Матэрыяльная дапамога на праезд аказваецца іншагароднім навучэнцам, сярэднедушавы даход сем'яў якіх па аб'ектыўных прычынах ніжэй за найбольшую велічыню бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва, зацверджанага Урадам Рэспублікі Беларусь, за два апошнія кварталы.

• Пры праходжанні вытворчага навучання ажыццяўляюцца грашовыя выплаты навучэнцам за выкананыя работы. Грашовыя сродкі за выраблену прадукцыю (работы, паслугі) у памеры не менш за 75 % накіроўваюцца на матэрыяльнае заахвочванне навучэнцаў з улікам іх удзелу ў вытворчасці гэтай прадукцыі.

Пакрыццё расходаў па найме жылля

У выпадку незабеспячэння месцам для пражывання ў інтэрнаце іншагародніх навучэнцаў і студэнтаў, якія атрымліваюць адукацыю ў дзённай форме за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, ажыццяўляецца пакрыццё расходаў па найме жылля штомесяц у наступных памерах:

• У Мінску — тры базавыя велічыні (81,0 руб.);

• У іншых населеных пунктах — дзве базавыя велічыні (54,0 руб.).

Ільготы пры карыстанні транспартам

Навучэнцам ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі аказваецца матэрыяльная дапамога на праезд у памеры, які не перавышае 50 працэнтаў ад кошту праезду (праязнога дакумента) да месца пражывання сем'яў (бацькоў):

• не больш чым за дзве паездкі (туды і назад) у месяц аўтамабільным пасажырскім транспартам агульнага карыстання рэгулярных міжгародніх зносін, чыгуначным транспартам агульнага карыстання міжрэгіянальных ліній эканом-класа;

• не больш чым за чатыры паездкі (туды і назад) у месяц аўтамабільным пасажырскім транспартам агульнага карыстання рэгулярных прыгарадных зносін (акрамя таксі), чыгуначным транспартам агульнага карыстання рэгіянальных ліній эканом-класа.

Ільготны крэдыт

На дзяржаўным узроўні падтрымліваюцца грамадзяне, якія атрымліваюць першую вышэйшую адукацыю на платнай аснове ў дзённай форме ў дзяржаўных установах вышэйшай адукацыі, УВА спажывецкай кааперацыі Рэспублікі Беларусь і УВА Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, шляхам выдавання крэдыту на льготных умовах (0,5 стаўкі рэфінансавання аплачваецца за кошт бюджэту).

Аб стыпендыі

Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 06.09.2011 № 398 «Аб сацыяльнай падтрымцы навучэнцаў» памеры стыпендый установлены ў велічынях, кратных бюджэту пражытачнага мінімуму для працаздольнага насельніцтва.

«Каханне можа быць у кожнага, як найвялікшае шчасце»

Што кажа праваслаўная царква пра шлюб?

Сучасны чалавек ведае пра тое, што амаль дзве трэці шлюбаў па статыстыцы заканчваюцца разводам. Нам не раз паведамлялі, што інстытут шлюбу састарэў, паняцце «вернасць у шлюбе» зжыло сябе і больш не трэба цярпець мужа або жонку, якія надакучылі. Бо так проста развесціся. А як трактуе шлюб і шлюбную вернасць праваслаўная царква? Пра гэта мы пагаварылі з магістрам багаслоўя, протаіерэем Яўгенам ГРАМЫКАМ.

«НЕ ВАРТА БУДАВАЦЬ СЯМ'Ю НА НЕНАДЗЕЙНЫМ ПАДМУРКУ»

— З пункту гледжання праваслаўя шлюб — гэта таінства, такое ж, як іншыя: хрышчэнне, споведзь, ці, напрыклад, святарства. Чалавек, які знаходзіцца па-за шлюбам, не мае права на інтымныя адносіны, як і той, хто не з'яўляецца святаром, не можа служыць у царкве, а нехрышчоны — прычашчацца або спавядацца. Толькі людзі, якія з'яўляюцца мужам і жонкай, могуць жыць як муж і жонка. Выбар спадарожніка жыцця павінен быць вельмі свядомы: шляху назад няма. Калі людзі перад Богам клянуцца адно аднаму ў вернасці, значыць, яны хочуць быць адзіным цэлым і павінны адказваць за свае словы. Не трэба спяшацца ў шлюб: ніхто не абмяжоўвае час падумаць, узважыць «за» і «супраць», зразумець, ці падыходзіць вам гэты чалавек. Так, у шлюб лепш уступаць, пакуль не склаліся звычкі халастога жыцця, інакш іх будзе вельмі цяжка ламаць. Але і спяшацца ў гэтым пытанні нельга. Прымаць рашэнне аб шлюбе павінны ўжо дастаткова дарослыя людзі: мужчына і жанчына з пэўным жыццёвым вопытам.

«Калі вернік уступае ў другі шлюб, падчас таінства святар просіць Госпада дараваць чалавеку, які па немачы не можа быць адзін. Апостал Павел кажа: «удавіцам і ўдаўцам лепш застацца такімі, як я» (а ён не быў жанаты). Бо праваслаўе вучыць аб тым, што муж і жонка павінны захоўваць вернасць адно аднаму нават пасля смерці».

— Але ж каханне не можа доўжыцца вечна. На працягу жыцця мы змяняемся, змяняюцца нашы мэты і патрэбы...

— Так, усе мы змяняемся з часам, і ў маладосці хочам ад адносін аднаго, а з узростам — ужо іншага. Але глыбінныя жаданні і памкненні застаюцца з чалавекам на працягу ўсяго жыцця. Таму сапраўднае каханне доўжыцца вечна. Проста мы вельмі часта прымаем за каханне закаханасць — а гэта розныя рэчы, і не варта будаваць свае адносіны на ненадзейным падмурку. Уступаючы ў шлюб, трэба спытаць сябе: ці гатовыя вы цярпець адно аднаго ў любой сітуацыі, прымаць не толькі вартасці, але і недахопы? Калі чалавек разумее, што заключае шлюб раз і назаўжды, ён вельмі добра падумае, перш чым надзець заручальны пярсцёнак.

«Не трэба шукаць ідэал! Ідэальных людзей няма, усе мы грэшныя. Але трэба дакладна разумець, з чым мы гатовыя мірыцца, што ў сілах прыняць, а што для нас недапушчальна».

«ПАЛОВАМІ АДЗІНАГА ЦЭЛАГА» НЕ НАРАДЖАЮЦЦА, А СТАНОВЯЦЦА»

— Калі ставіцца да шлюбу настолькі сур'ёзна, можна так і не рашыцца на яго...

— Не можаш знайсці таго, каго прымеш усім сэрцам, — заставайся нежанаты (незамужняя). Але, паверце, калі чалавек шукае, ён абавязкова знойдзе тое, што яму сапраўды неабходна. Праўда, толькі ў тым выпадку, калі разбярэцца ў сабе і сумленна адкажа на пытанне, чаго ён чакае ад сваёй выбранніцы (выбранніка), ад сям'і, якую створыць, што для яго галоўнае, а што другарадна. І тут хацелася б перасцерагчы яшчэ ад адной памылкі. Не трэба шукаць ідэал! Ідэальных людзей няма, усе мы грэшныя. Але трэба дакладна разумець, з чым мы гатовыя мірыцца, што ў сілах прыняць, а што для нас недапушчальна. Шмат каму здаецца: дзесьці ходзіць мая «палавінка», яе трэба толькі адшукаць. Але справа ў тым, што на самай справе паловамі адзінага цэлага не нараджаюцца, а становяцца. Тая самая «палавінка» сапраўды ёсць у кожнага — але, так бы мовіць, у патэнцыяле. І калі людзі сыходзяцца, вырашыўшы, што яны могуць быць дзвюма паловамі адзінага цэлага, толькі ад іх залежыць, ці здолеюць яны сапраўды імі стаць. Не ад кагосьці аднаго, мужа ці жонкі. Не ад кагосьці старонняга — дзяцей, цешчы, свекрыві, свёкра, цесця і г. д. І нават не ад Бога. Толькі ад іх дваіх. Каханне — гэта сур'езная праца. Пастаянная духоўная праца над сабой.

— Ну, а калі гаварыць аб другім шлюбе — чаму ён недапушчальны з пункту гледжання хрысціянства? Бывае ж і так, што чалавек знаходзіць шчасце менавіта ў другім, больш асэнсаваным і «дарослым» сямейным саюзе...

— Праваслаўная царква адмоўна ставіцца да другога шлюбу. Для паўторнага шлюбу магчымыя наступныя прычыны: смерць мужа ці жонкі, здрада альбо хатні гвалт. У двух апошніх выпадках царква развядзе, таму што шлюб усё роўна ўжо разбураны, любоў памерла і захоўваць няма чаго. Калі вернік уступае ў другі шлюб, падчас таінства святар просіць Госпада дараваць чалавеку, які па немачы не можа быць адзін. Апостал Павел кажа: «удавіцам і ўдаўцам лепш застацца такімі, як я» (а ён не быў жанаты). Бо праваслаўе вучыць аб тым, што муж і жонка павінны захоўваць вернасць адно аднаму нават пасля смерці. Тыя, хто лічаць, што такога кахання не бывае, памыляюцца. Менавіта такое каханне апявалі ва ўсе часы, і яно можа быць у кожнага, як найвялікшае шчасце. Трэба толькі, ачысціўшы душу і розум, з Божай дапамогай адшукаць яго.

«СЯМЕЙНАЕ ШЧАСЦЕ ЦАЛКАМ ДАСЯГАЛЬНАЕ»

— А што гаворыць праваслаўе аб шлюбнай вернасці?

— З хрысціянскага пункту гледжання, мужчына і жанчына, што знаходзяцца ў шлюбе, павінны быць верныя адно аднаму не толькі ў справах, але нават у словах і думках. Сёння мужчын пераканалі, што вернасць — для жанчын, а мужчына па прыродзе сваёй палігамны. Але з царкоўнага пункту гледжання такое апраўданне непрымальнае. Прамовіўшы перад алтаром словы клятвы, мужчына павінен з гэтага часу глядзець толькі на адну жанчыну, а ў астатніх бачыць сясцёр. У рускай, англійскай ці нямецкай мовах шматграннае паняцце «любоў» абазначаецца толькі адным словам. У беларускай мове ёсць слова «каханне», якое акрэслівае менавіта любоў да жанчыны. У грэчаскай мове ёсць чатыры варыянты слова са значэннем «любоў»: «эрас», «старгі», «філія», «агапі». Прычым «эрас» лічыцца ніжэйшай ступенню любові, яе самай нязначнай праявай. «Агапі» — найвышэйшае праява любові, гэтым словам пазначаецца толькі каханне да жонкі (мужа) і любоў да Бога. Гэта вельмі мудра. Каханне не зводзіцца да страсці. Калі людзі шукаюць толькі страсць, яны яе страцяць. Перш чым ісці да алтара, трэба пачакаць, пакуль схлыне страсць, і паглядзець, ці народзіцца з яе каханне, падобнае па сваёй сутнасці з любоўю да Нябеснага Айца. З пункту гледжання праваслаўя закаханыя, не ўступаючы ў інтымныя адносіны, павінны як мага часцей сустракацца, размаўляць, высвятляць пазіцыі адно аднаго па розных жыццёвых пытаннях, глядзець адно на аднаго ў розных сітуацыях. І толькі па сканчэнні досыць працяглага часу (гэта можа быць год ці два) рабіць выснову, ці могуць яны жыць разам усё жыццё.

«Уступаючы ў шлюб, трэба спытаць сябе: ці гатовыя вы цярпець адно аднаго ў любой сітуацыі, прымаць не толькі вартасці, але і недахопы? Калі чалавек разумее, што заключае шлюб раз і назаўжды, ён вельмі добра падумае, перш чым надзець заручальны пярсцёнак».

— А ці можна лічыць здрадай будучаму мужу (жонцы) інтымныя адносіны да шлюбу (і да сустрэчы з выбраннікам)?

— Так. Гэта, так бы мовіць, «здрада наперад». Чалавек яшчэ не ведае сваю сапраўдную выбранніцу або выбранніка, але ўжо здраджвае ёй (яму), тым самым парушаючы цэласнасць будучага шлюбнага саюзу. Інтымныя адносіны — гэта сувязь. Першая сувязь самая моцная, разарваць яе цяжка. У далейшым повязі становяцца ўсё слабей. Калі дзяўчына пажыла з адным, другім, пятымдзясятым, чаму б ёй не пажыць з адзінаццатым? Перабіранне мужчын (гэтак жа, як і супрацьлеглы варыянт — перабіранне жанчын мужчынамі) царква называе амаральным, таму што ў канчатковым выніку чалавек губляе здольнасць прымаць і дарыць каханне. А гэта робіць яго няшчасным. Паверце майму святарскаму вопыту — сямейнае шчасце цалкам дасягальнае, важна вучыцца слухаць, чуць і адчуваць адно аднаго.

«Выбар спадарожніка жыцця павінен быць вельмі свядомы: шляху назад няма. Калі людзі перад Богам клянуцца адно аднаму ў вернасці, значыць, яны хочуць быць адзіным цэлым і павінны адказваць за свае словы. Не трэба спяшацца ў шлюб: ніхто не абмяжоўвае час падумаць, узважыць «за» і «супраць», зразумець, ці падыходзіць вам гэты чалавек».

Размаўляла Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

«Я НЕ РАБЛЮ З ДЗЯЦЕЙ ЧЭМПІЁНАЎ»

СПОРТ З ПЕРШЫХ ГАДОЎ ЖЫЦЦЯ

— Мы з Асоль прытрымліваемся наступнага прынцыпу ў фізічным выхаванні дзяцей: развіць каардынацыю, дыхальную сістэму, мозг і ўжо пасля даваць целу нагрузкі. Наша мама працуе ў каардынацыйным спорце. А для зусім малых дзяцей каардынацыйны спорт неабходны для гарманічнага росту і развіцця. Таму ўсе нашы дзеці пачыналі з гімнастыкі, батутаў. Мне спадабаўся эксперымент, калі яны займаліся брэйк-дансам. Музыка, танцы далі свае плады для развіцця каардынацыі, рухальных навыкаў. З дзяцінства дзеці плаваюць, гэта абавязкова. Усе трэніруюць мозг шахматамі, што важна для ўсебаковага развіцця. Спартыўная база ў іх каласальная — брэйк-данс, гімнастыка, батуты, акрабатыка, плаванне, шахматы. Зараз Асоль вучыць дзяцей катацца на снаўбордзе з усімі вінтамі, сальта, скачкамі. У два гады яна паставіла дзяцей на лыжы. У Еўропе гэта папулярна. Лыжы для дзяцей бяспечныя, чаго нельга сказаць пра канькі ці ролікі. Ступня ў лыжных бацінках стаіць надзейна, самі бацінкі да калень, інструктар усё кантралюе, і дзеці проста слізгаюць. Яны, можа, і самі яшчэ не разумеюць, што адбываецца, але ім падабаецца.

Пакуль вынікі нашага падыходу я магу назіраць толькі ў старэйшага Радаміра, яму 12 гадоў. Ён ужо выбраў, што падабаецца найбольш. Мне асабліва прыемна, што сын абраў канькі — канькабежны спорт, шорт-трэк, ролерспорт. У другога сына, Елісея, астма, і яму рэкамендавана перыядычна ездзіць на мора, ён актыўна займаецца парусным спортам. Ад плавання паступова адыходзіць — мабыць, стала сумна, але мне заўжды здавалася, што плаваць весела. Ходзіць з мамай на снаўборд, на батуты, і... іграе на флейце. Але на каньках і ролiках катаецца мала. Пяцігадовы Міраслаў і трохгадовая Мія яшчэ вельмі маленькія, таму разам з мамай развіваюць каардынацыю, ходзяць у басейн. Міраслаў часам можа на каньках пакатацца. На дзень нараджэння вельмі прасіў хуткасныя канькі. Я ў Галандыі купіў яму добрыя, дарагія канькі, ад душы падарылі. А ён некалькі разоў пакатаўся, а потым згубіў. Праз месяц знайшлі, але яны яго ўжо не цікавяць, мабыць, яшчэ да канца не разумее, навошта яны патрэбныя і якое задавальненне могуць прынесці.

СПАБОРНІЦТВЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ У РАДАСЦЬ

Я заўсёды вучу дзяцей успрымаць спаборніцтвы як свята і стараюся іх такімі зрабіць. Я рэкамендую ўсім бацькам не рабіць з дзяцей чэмпіёнаў у раннім узросце. Чалавек павінен вучыцца перамагаць у 18-20 гадоў. А ў дзяцінстве ён павінен палюбіць спорт, навучыцца правільна выконваць практыкаванні, авалодаць тэхнікай. А часцей за ўсё мы бачым, што

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

бацькі на спаборніцтвах ганяюць дзяцей, як ганчакоў, і хіба што не робяць стаўкі. І гэта абсалютна няправільна, так робяць бацькі, якія праз дзяцей жадаюць пацешыць сваё самалюбства і задаволіць амбіцыі. Гэта негатыўна ўплывае на псіхіку дзяцей. Я бачыў шмат малых, якія, заняўшы трэцяе месца, рыдаюць так, нібыта яны Алімпійскія гульні прайгралі. Я катэгарычна супраць такога падыходу, мы прыязджаем на спаборніцтвы, як на свята. Для нас спаборніцтвы — своеасаблівы рытуал, свята, каб зарадзіцца энергіяй, добра правесці час. Радамір да 10 гадоў на роліках нічога не выйграваў, але цяпер уваходзіць у тройку лідараў. Елісей і Міраслаў таксама часта аказваюцца ў тройцы найлепшых. Усе дзеці хочуць перамагаць, але і пройгрышы — не катастрофа, і навучыць гэтаму — адказнасць бацькоў.

АДЗНАКІ Ў ШКОЛЕ НЕ ГАЛОЎНАЕ

Нашы дзеці вучацца ў 29-й гімназіі Мінска, і настаўнікі з разуменнем ставяцца да іх спартыўных заняткаў, заахвочваюць гэта. Пакуль школьнікі толькі Радамір і Елісей, і яны вучацца нядрэнна. У старэйшага пачаўся перыяд, як у прыказцы «вучань без двойкі — як салдат без аўтамата», але ў цэлым усё добра. Адзнакі кантралюе мама, у мяне крыху іншы падыход. Я лічу, што важныя не адзнакі, а сам працэс, бо школа павінна выхоўваць асобу. Я не сварыся на сыноў за дрэнныя адзнакі. Я разам з дзіцем аналізую, дзе ён памыліўся, недавучыў, і прапаную гэта абмеркаваць з настаўнікам. І такім чынам чалавек у 12 гадоў сам шукае рашэнне сваёй праблемы. Ён разумее, у чым яго памылка, і сам яе выпраўляе. Запамінае, што для таго, каб чагосьці дасягнуць, трэба прыкладаць намаганні. Я не радуюся добрым адзнакам, я радуюся працэсу іх дасягнення.

Канешне, многае залежыць і ад настаўніка. Школьны настаўнік падобны на спартыўнага трэнера. Менавіта трэнер прывівае любоў да спорту, развівае тэхніку, матывуе спартсменаў. Калі б я не зараджаў сваіх спартсменаў энергіяй, не праяўляў сваю зацікаўленасць, яны б ніводнага медаля не завявалі. І ў школе гэтаксама, дзіця праяўляе цікавасць да вучобы, калі бачыць зацікаўленасць настаўніка. Я ў школе быў троечнікам, настаўнікі былі незацікаўленыя, а я дэматываваны. А калі ў восьмым класе перайшоў у вучылішча алімпійскага рэзерву і ўбачыў інтарэс настаўнікаў, атрымаў ад іх зваротную сувязь, стаў вучыцца. Вучылішча скончыў без адзінай тройкі ў атэстаце.

ТАЙМ-МЕНЕДЖМЕНТ І САМАСТОЙНАСЦЬ — НАША ЎСЁ

Спорт развівае ў дзяцей самастойнасць і адказнасць. Старэйшыя хлопцы з сямі-васьмі гадоў самастойна ездзяць на грамадскім транспарце на трэніроўкі, вучобу. Для мамы і бабуль — гэта, канешне, стрэс, але спраўляюцца. Больш цяжкасцяў узнікае з бытам. Калі мяне няма дома, хлопцы часта сварацца, спрачаюцца паміж сабой. Я ім адкрыта кажу: «Вы мае тры асілкі, якія павінны дапамагаць. Я зарабіў грошы, схадзіў у краму, прыгатаваў ежу. Я стаміўся, давайце кожны памыем па дзве талеркі». І іх зацягвае такі гульнявы фармат, яны ўсё робяць — і смецце выносяць, і з сабакам гуляюць, і ў краму ходзяць. Галоўнае — даць дзецям матывацыю і не забываць хваліць.

НЕ СПОРТАМ АДЗІНЫМ

Як бацька я мару, каб хоць нехта з маіх дзяцей займаўся спортам найвышэйшых дасягненняў. Было бы выдатна, як у легендах ці казках — я і мае тры сыны-волаты, якія ўсіх перамагаюць. Але гэта толькі мары, я імкнуся не быць надта ўцягнутым у спартыўную кар'еру сваіх дзяцей. На спаборніцтвах я за імі назіраю, ганаруся, але я ні ў якім разе не шалёны тата-трэнер. І ўвогуле на турнірах я перадаю сыноў іншаму трэнеру, а сам адыходжу. Я разумею, што чым больш я буду займацца з імі спортам, тым больш балюча мне потым будзе. Я буду ўскладаць на іх вялікія спартыўныя надзеі, а яны могуць іх не апраўдаць, і дрэнна будзе ўсім. Не хачу такога. У мяне няма мэты зрабіць са сваіх дзяцей чэмпіёнаў. Я хачу дапамагаць сваім дзецям, накіроўваць іх, каб яны самі ішлі да сваіх мэтаў і заваёўвалі медалі сваёй працай.

Радамір у канькабежным спорце — адзін з найлепшых у краіне ў сваім узросце. Але я хачу, каб мае дзеці не былі зацыкленыя толькі на спорце. Я інвестую ў тое, каб яны абавязкова ведалі англійскую мову. Я інвестую ў іх развіццё ў камп'ютарных тэхналогіях, бо за гэтым будучыня. У сучасным свеце чалавек з такімі ведамі запатрабаваны ўсюды. І гэта лёгка сумяшчаць са спортам. Можна, знаходзячыся на спаборніцтвах, вечарам спакойна працаваць за камп'ютарам, зарабляць грошы, а раніцай — выходзіць і перамагаць. Такія прыклады ёсць. Таму мае дзеці развіваюцца і ў гэтым кірунку.

ДЗЕЦЯМ ПАТРЭБНЫ НЕ МУЛЬЦІКІ, А МУЛЬТЫСПОРТ

У ролер-школе Сяргея Мініна мы развіваем канцэпцыю мультыспорту, калі дзеці займаюцца рознымі відамі. У нашай краіне да гэтага ставяцца неяк насцярожана, але гэта папулярная і эфектыўная практыка замежных спартсменаў. Дзеці не павінны займацца адным і тым жа спортам з самага пачатку, можа хутка надакучыць. Мультыспорт прадугледжвае розныя практыкаванні на кожным занятку. А пасля можна выбіраць занятак па душы і здольнасцях. Амаль уся беларуская нацыянальная каманда па канькабежным спорце прайшла праз мультыспорт, ён робіць тэхніку больш пластычнай, павышае каардынацыю. Ніхто б не ведаў Віталія Міхайлава, які прывёз столькі медалёў з міжнародных спаборніцтваў, калі б ён у свой час не зацікавіўся ролікамі. Марафоны на роліках дапамаглі яму зразумець тэхніка-тактычныя аспекты катання на лёдзе. Марына Зуева ніколі б не вярнулася ў канькабежны спорт без ролікаў. І цяпер усе мае спартсмены займаюцца чатырма відамі спорту — канькабежным, шорт-трэкам, ролер-спортам і веласпортам. Мультыспорт у цыклічных відах спорту дае магчымасць пераключыцца — вельмі цяжка пастаянна рабіць адно і тое ж. І гэта дарослым спартсменам, а як дзецям!

З ролер-школай цесна супрацоўнічае 29-я гімназія, у якой вучацца мае дзеці. І гэта вельмі добра, я ўжо пяць гадоў прапаноўваю ўвесці на школьных уроках фізкультуры катанне на роліках. Ролікі і ўсё, што звязана з ходам канькоў, — выдатная магчымасць для фізічнага развіцця. Гэты навык патрэбны ў лыжах, біятлоне, хакеі, фігурным катанні, канькабежным спорце. Такім чынам, на ўроках фізкультуры з дапамогай адных толькі ролікаў можна закласці дзецям базу для шасці-васьмі відаў спорту.

ГАЛОЎНАЕ — ПРЫКЛАД ДАРОСЛЫХ

Калі ў сям'і спортам займаюцца не толькі дзеці, але і бацькі, можна гаварыць пра культуру сям'і. У нас былі прыклады, калі бацькі прыводзілі дзяцей у школу і самі пачыналі катацца на роліках. А потым заўважылі, што фігура падцягнулася, з'явілася больш сіл. Канешне, дзеці будуць браць прыклад з мамы і таты, якія займаюцца спортам. Не трэба сябе напружваць. Лёгкага бегу, катання на каньках ці роліках, плавання, лыжаў, ровара будзе дастаткова. Важна, каб добра працавала сардэчна-сасудзістая сістэма, суставы не зношвалася, для гэтага дастаткова лёгкай фізічнай нагрузкі. Нельга забываць пра культуру харчавання, не трэба многа есці вечарам. На снеданне — каша з мёдам ці арэхамі. А ў нас людзі не заўсёды сочаць за тым, што ядуць.

«Мы з Асоль прытрымліваемся наступнага прынцыпу ў фізічным выхаванні дзяцей: развіць каардынацыю, дыхальную сістэму, мозг і ўжо пасля даваць целу нагрузкі».

Я скончыў спартыўную кар'еру ў 2006 годзе. І не магу сказаць, што з таго часу вяду вельмі правільны і спартыўны спосаб жыцця. Але ў мяне не падае мышачная маса, не пагаршаецца здароўе, магу праехаць 150 кіламетраў на веласіпедзе, падцягнуцца. Я проста два-тры разы на тыдзень займаюся фізічнай актыўнасцю. Нядаўна вярнуўся дамоў вельмі стомлены, энергіі зусім не было. Але вырашыў 20—30 хвілін пакатацца на ровары. Тое, што адбываецца ў арганізме ў гэты момант, проста здзіўляе. Пачынаюць выдзяляцца гармоны шчасця, і сілы вяртаюцца, унутры столькі таго шчасця і энергіі, што можна працаваць яшчэ некалькі гадзін.

Памятаю, былі на спаборніцтвах у Нарвегіі. З раніцы ў 5.30 я пайшоў пабегаць вакол возера. І не перадаць маё здзіўленне, калі я ўбачыў шмат людзей сталага ўзросту, якія бегалі, выконвалі фізічныя практыкаванні. Вечарам карціна паўтарылася. І на маё пытанне, як такое магчыма, нарвежская каляжанка дала цудоўны адказ: «Мы вельмі хочам жыць, таму і займаемся». Гэта культура ўсяго народа, яны так жывуць.

І калі дарослыя людзі будуць вельмі хацець жыць і падтрымліваць для гэтага фізічную актыўнасць, дзеці будуць браць з іх прыклад. І тады ў нас таксама будзе культура здаровага спосабу жыцця ў кожнай сям'і асобна і ва ўсёй краіне ў цэлым.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота з асабістага архіва героя.

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Выигрывай в Виталюр!»

Сведения об организаторе – является Общество с ограниченной ответственностью «ЭфСиБи Бел» (далее – Организатор), УНП 193185741.

Юридический адрес: Республика Беларусь, 220037, г. Минск, пер. Козлова, д. 25, пом. 22.

Территория проведения рекламной игры: магазины «Виталюр», расположенные на территории Республики Беларусь.

Срок начала рекламной игры: 16.09.2020.

Срок окончания рекламной игры: 04.12.2020.

Сведения о государственной регистрации рекламной игры: свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3846 от 31.08.2020, выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Сведения о количестве участников рекламной игры: 54 628 участников.

Призовой фонд разыгран полностью.

Победители рекламной игры:

приз: подарочный сертификат «Виталюр» с номинальной стоимостью 200 BYN

Срок действия – до 31 марта 2021 года. Денежные средства в сумме 8,97 белорусского рубля.

№	ФИО	Приз	Дата выдачи выигрыша
1	Паламарчук Василий Васильевич	Подарочный сертификат «Виталюр» с номинальной стоимостью 200 BYN. Срок действия – до 31 марта 2021 года. Денежные средства в сумме 8,97 белорусского рубля	29.09.2020
2	Лапцевич Николай Владимирович	Подарочный сертификат «Виталюр» с номинальной стоимостью 200 BYN. Срок действия – до 31 марта 2021 года. Денежные средства в сумме 8,97 белорусского рубля	29.09.2020
3	Деревянко Анна Ивановна	Подарочный сертификат «Виталюр» с номинальной стоимостью 200 BYN. Срок действия – до 31 марта 2021 года. Денежные средства в сумме 8,97 белорусского рубля	29.09.2020
4	Гоманькова Наталья Александровна	Подарочный сертификат «Виталюр» с номинальной стоимостью 200 BYN. Срок действия – до 31 марта 2021 года. Денежные средства в сумме 8,97 белорусского рубля	29.09.2020
5	Фёдоров Олег Сергеевич	Подарочный сертификат «Виталюр» с номинальной стоимостью 200 BYN. Срок действия – до 31 марта 2021 года. Денежные средства в сумме 8,97 белорусского рубля	29.09.2020
6	Парабкович Евгения Яковлевна	Подарочный сертификат «Виталюр» с номинальной стоимостью 200 BYN. Срок действия – до 31 марта 2021 года. Денежные средства в сумме 8,97 белорусского рубля	29.09.2020
7	Чиженок Елена Леонидовна	Подарочный сертификат «Виталюр» с номинальной стоимостью 200 BYN. Срок действия – до 31 марта 2021 года. Денежные средства в сумме 8,97 белорусского рубля	29.09.2020
8	Володько Наталья Николаевна	Подарочный сертификат «Виталюр» с номинальной стоимостью 200 BYN. Срок действия – до 31 марта 2021 года. Денежные средства в сумме 8,97 белорусского рубля	29.09.2020
9	Коконов Михаил Витальевич	Подарочный сертификат «Виталюр» с номинальной стоимостью 200 BYN. Срок действия – до 31 марта 2021 года. Денежные средства в сумме 8,97 белорусского рубля	29.09.2020
10	Клюйко Янина Васильевна	Подарочный сертификат «Виталюр» с номинальной стоимостью 200 BYN. Срок действия – до 31 марта 2021 года. Денежные средства в сумме 8,97 белорусского рубля	29.09.2020
11	Раловец Татьяна Мстиславовна	Подарочный сертификат «Виталюр» с номинальной стоимостью 200 BYN. Срок действия – до 31 марта 2021 года. Денежные средства в сумме 8,97 белорусского рубля	05.10.2020
12	Юхнович Людмила Михайловна	Подарочный сертификат «Виталюр» с номинальной стоимостью 200 BYN. Срок действия – до 31 марта 2021 года. Денежные средства в сумме 8,97 белорусского рубля	05.10.2020
13	Дорош Валентина Михайловна	Подарочный сертификат «Виталюр» с номинальной стоимостью 200 BYN. Срок действия – до 31 марта 2021 года. Денежные средства в сумме 8,97 белорусского рубля	05.10.2020
14	Савельева Татьяна Валерьевна	Подарочный сертификат «Виталюр» с номинальной стоимостью 200 BYN. Срок действия – до 31 марта 2021 года. Денежные средства в сумме 8,97 белорусского рубля	05.10.2020
15	Кришталь Татьяна Николаевна	Подарочный сертификат «Виталюр» с номинальной стоимостью 200 BYN. Срок действия – до 31 марта 2021 года. Денежные средства в сумме 8,97 белорусского рубля	05.10.2020
16	Стояк Екатерина Владимирович	Подарочный сертификат «Виталюр» с номинальной стоимостью 200 BYN. Срок действия – до 31 марта 2021 года. Денежные средства в сумме 8,97 белорусского рубля	05.10.2020
17	Шейбак Виктория Викторовна	Подарочный сертификат «Виталюр» с номинальной стоимостью 200 BYN. Срок действия – до 31 марта 2021 года. Денежные средства в сумме 8,97 белорусского рубля	05.10.2020
18	Чигир Лариса Сергеевна	Подарочный сертификат «Виталюр» с номинальной стоимостью 200 BYN. Срок действия – до 31 марта 2021 года. Денежные средства в сумме 8,97 белорусского рубля	05.10.2020
19	Метельская Наталия Александровна	Подарочный сертификат «Виталюр» с номинальной стоимостью 200 BYN. Срок действия – до 31 марта 2021 года. Денежные средства в сумме 8,97 белорусского рубля	05.10.2020
Аднаўленчая дзейнасць на тэрыторыі замка кіпіць і ўнутры, і звонку. Разам з «абжываннем» памяшканняў ідзе добраўпарадкаванне ўнутранага двара, амаль усе запланаваныя графіта нанесеныя.

Нягледзячы на тое, што першая чарга мае вялікія плошчы, хацелася заглянуць у каралеўскі палац. Па задумках праекціроўшчыкаў, ён будзе ўзнаўляцца ў другую чаргу.

ГІСТАРЫЧНАЯ ДАКЛАДНАСЦЬ

Стары замак, нібы пяцьсот гадоў таму, зноў стаў пунктам гарачых абмеркаванняў. Вакол праекта па аднаўленні аб'екта вядзецца мноства спрэчак сярод гісторыкаў, археолагаў і будаўнікоў. У кожнага з удзельнікаў свой — рабочы фронт, і толькі ў цеснай узгодненасці можна дасягнуць якасных вынікаў.

У сваёй дзейнасці спецыялісты арыентуюцца на досвед калег, у тым ліку з іншых краін. Каб пазбегнуць спрэчак, навуковыя работнікі праводзяць канферэнцыі з удзелам гісторыкаў, спецыялістаў у галіне архітэктуры і захавання гісторыка-культурнай спадчыны з Беларусі і замежжа.

Ва ўпраўленні культуры аблвыканкама паведамілі, што археалагічныя даследаванні на Замкавай гары будуць весціся і далей. Гэта дазволіць, у прыватнасці, актуалізаваць гістарычную даведку. Спецыялісты працягнуць даследаваць аб'ёмы будынка палаца і іншых пабудоў, якія захаваліся, каб выкарыстаць атрыманыя звесткі пры праектаванні другой чаргі рэканструкцыі замка.

Пакуль я не апынулася ў цэнтры рэстаўрацыйных работ, нават не ўяўляла, наколькі гэта скрупулёзны, дэталёвы і адказны працэс — сапраўдны пункт кампрамісу паміж меркаваннямі і бачаннем працэсу рэканструкцыі навуковай супольнасцю, мясцовай уладай і грамадскасцю.

Аліса СКІБА.
Фота Яна ХВЕДЧЫНА.

БЕЛАРУСБАНК

ОАО «Акционерный Сберегательный банк «Беларусбанк»

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 октября 2020 г.

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2020 год	2019 год
1	2	3	4	5
1	**АКТИВЫ**			
2	Денежные средства	1101	538 979	451 865
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	1 047	955
4	Средства в Национальном банке	1103	1 895 851	1 873 025
5	Средства в банках	1104	3 119 594	2 991 412
6	Ценные бумаги	1105	4 006 092	3 438 825
7	Кредиты клиентам	1106	26 273 794	20 840 107
8	Производные финансовые активы	1107	43 058	-
9	Инвестиции в зависимые юридические лица	11071	-	127 304
10	Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица	11072	-	-
11	Долгосрочные финансовые вложения	1108	166 540	29 024
12	Основные средства и нематериальные активы	1109	415 197	430 116
13	Доходные вложения в материальные активы	1110	106 150	108 096
14	Имущество, предназначенное для продажи	1111	555	439
15	Отложенные налоговые активы	1112	1 438	1 438
16	Деловая репутация	11121	-	-
17	Прочие активы	1113	171 355	132 990
18	ИТОГО активы	11	36 739 650	30 425 596
19	**ОБЯЗАТЕЛЬСТВА**			
20	Средства Национального банка	1201	755 377	63 393
21	Средства банков	1202	7 593 029	4 617 197
22	Средства клиентов	1203	21 854 843	19 568 954
23	Ценные бумаги банка	1204	1 754 491	1 572 258
24	Производные финансовые обязательства	1205	30 001	-
25	Отложенные налоговые обязательства	1206	1 578	1 578
26	Прочие обязательства	1207	407 061	276 982
27	ВСЕГО обязательства	120	32 396 380	26 100 362
28	**СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ**			
29	Уставный фонд	1211	2 662 984	2 662 480
30	Эмиссионный доход	1212	-	-
31	Резервный фонд	1213	496 551	439 732
32	Фонды переоценки статей баланса	1214	169 663	188 356
33	Накопленная прибыль	1215	1 014 072	1 034 666
34	Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации	12151	4 343 270	4 325 234
35	Доля неконтролирующих акционеров	12152	-	-
36	ВСЕГО собственный капитал	121	4 343 270	4 325 234
37	ИТОГО обязательства и собственный капитал	12	36 739 650	30 425 596

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ о прибылях и убытках на 1 октября 2020 года

(в тысячах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	2020 год	2019 год
1	2	3	4	5
1	Процентные доходы	2011	1 674 797	1 570 087
2	Процентные расходы	2012	715 416	654 357
3	Чистые процентные доходы	201	959 381	915 730
4	Комиссионные доходы	2021	396 783	360 815
5	Комиссионные расходы	2022	140 980	121 310
6	Чистые комиссионные доходы	202	255 803	239 505
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	1 115	276
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	456	891
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	175 766	73 587
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	398	232
11	Чистые отчисления в резервы	207	601 556	221 490
12	Прочие доходы	208	51 300	53 246
13	Операционные расходы	209	545 223	571 644
14	Прочие расходы	210	81 723	44 145
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211	215 717	446 188
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212	52 543	57 049
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2	163 174	389 139
18	Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц	30	-	10 505
19	Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц	31	-	-
20	ИТОГО ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	3	163 174	399 644
21	Доля в прибыли (убытке), принадлежащая головной организации	32	163 174	399 644
22	Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке)	33	-	-

Заместитель Председателя Правления А.А. Егоров

Главный бухгалтер И.П. Лысоковская

Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте www.belarusbank.by и в отделениях «Беларусбанка»

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 11.01.2019, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Пуховичского районного потребительского общества (продавец) проводит открытый аукцион по продаже недвижимого имущества в составе:

Лот № 1: кафе «Хельсинки» с инв. № 602/D-35365 общей площадью 768,1 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Новая Заря, 34А-2.

Начальная цена с НДС – **835 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – 83 500,00 бел. руб.).

Лот № 2 (повторный): магазин № 22 *(составные части и принадлежности: склад, тамбур, сарай)* **с инв. № 602/С-22083 общей площадью 99,7 кв. м, расположенный на земельном участке площадью 0,0600 га (право аренды по 26.05.2065) с кадастровым номером 624484802001000036 по адресу: Минская область, Пуховичский район, Пережирский с/с, д. Едлино, ул. Раздольная, 26.**

Начальная цена с НДС – **8 400,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **840,00** бел. руб.). *Цена снижена на 65 %.*

Лот № 3 (повторный): магазин *(составные части и принадлежности: пристройка, сарай)* **с инв. № 602/С-54171общей площадью 86,4 кв. м, расположенный на земельном участке площадью 0,1000 га (право аренды по 13.10.2065) с кадастровым номером 624487006601000127 по адресу: Минская область, Пуховичский район, Дубровский с/с, д.Синча, ул. Центральная, 50Б.** *Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: охранная зона линий электропередачи до 1000 В, площадь – 0,0046 га.*

Начальная цена с НДС – **7 200,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **720,00** бел. руб.). *Цена снижена на 55 %.*

Лот № 4 (повторный): магазин *(составные части и принадлежности: склад)* **с инв. № 602/С-13794 общей площадью 78,4 кв. м, расположенный на земельном участке площадью 0,0245 га (право постоянного пользования) с кадастровым номером 624487909601000148 по адресу: Минская область, Пуховичский район, Туринский с/с, д. Уголец.** *Земельный участок имеет ограничения прав в использовании: водоохранная зона реки Волма, площадь – 0,0245 га.*

Начальная цена с НДС – **6 650,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **665,00** бел. руб.). *Цена снижена на 65 % процентов.*

Объекты находятся под запретом совершения регистрационных действий. Запрет будет снят после произведения оплаты на расчетные счета министерства юстиции Республики Беларусь и Министерства финансов.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в следующем размере: по лоту № 1 – 2 (два) процента от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лотам №№ 2, 3, 4 – 10 (десять) процентов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения по отношению к лоту № 2, к лоту № 3, к лоту № 4 были опубликованы в газете «Звязда» от 09.06.2020, 18.09.2020.

Аукцион состоится **14.01.2021** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **13.01.2021** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17.

УНН 600115965

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «СОЛИГОРСКВОДСТРОЙ» (продавец) проводит открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ ДИСПЕТЧЕРСКОЙ КИРПИЧНОЙ, площадью 38,6 кв. м, инв. № 643/С-15193, расположенной на земельном участке с кадастровым номером 623450100001003223 *(право аренды по 04.08.2119)* площадью 0,0728 га, по адресу: Минская область, г. Любань, ул. Боровика, 46/10.

Начальная цена с НДС (20 %) – **5 660,28** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **566,00** бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских после заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **19.01.2021** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.01.2021** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17, 136-31-11.

УНН 600028496

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении 18.12.2020 повторного открытого аукциона

ПО ПРОДАЖЕ КВАРТИРЫ,

принадлежащей ОАО «Строительный трест № 12» Управляющая компания Холдинга «СТРОЙТРЕСТ-ХОЛДИНГ»

Лот № 1: изолированное помещение с инвентарным номером 700/D-154881 – квартира, площадью 78,3 кв. м, адрес: г. Могилев, ул. Ленинская, 59-12.

Начальная цена продажи: 169 100,00 белорусского рубля.

Аукцион состоится 18 декабря 2020 года в 12.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Информация о предыдущих аукционах была опубликована в номерах газеты «Звязда» от 26.08.2020 и 03.11.2020.

Организатор аукциона: Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 351, 352, **+375222-72-41-14, +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by**

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «БАТЭ» – управляющая компания холдинга «Автокомпоненты», г. Борисов, ул. Даумана, 95**

Предмет аукциона: недвижимое имущество, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Даумана, 109

Магазин (здание специализированное розничной торговли), общ. пл. 319,1 кв. м, инв. номер 610/С-27467. **Составные части и принадлежности:** двухэтажное кирпичное здание магазина (А1-2/к), пристройка (1), дорожки (а1), декоративный водопад (а2)

Сведения о земельном участке: общ. пл. 0,0621 га, предоставлен Продавцу на праве аренды сроком по 06.07.2045 для строительства и облуживания магазина

Начальная цена (с НДС 20 %) – 250 450,31 белорусского рубля

Порядок ознакомления с предметом аукциона: понедельник–пятница с 9.00 до 15.00. Иванов Дмитрий Олегович (главный инженер), тел.: +375 29 657-61-84; 8 (0177) 78-84-17

Задаток 10 % от начальной цены лота перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять) рабочих дней** после проведения аукциона

Условия аукциона

Покупатель (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) обязан возместить Продавцу расходы на рыночную оценку предмета аукциона в размере 150,00 (сто пятьдесят белорусских рублей 00 копеек)

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию и проведения аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Продавец или Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов было опубликовано в газете «Звязда» от 24.10.2020

Дата и время проведения аукциона	**15.12.2020 в 11.00, по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Дата и время окончания приема документов	**11.12.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**
Контактные данные	**+375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ (объявление) о проведении 13 декабря 2020 года торгов по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «ТОПЗАПЭЛЕКТРО»

Предмет торгов

Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-65609 общей площадью 6583,7 кв. м (назначение – здание специализированное автомобильного транспорта; наименование – подземная автостоянка)

Имущество расположено на земельном участке с кадастровым номером 500000000005008567, площадью – 0,4099 га, назначение – для обслуживания здания специализированного автомобильного транспорта (право постоянного пользования)

Местонахождение: г. Минск, ул. Михаловская, 18.

Начальная цена: 3 010 163,39 белорусского рубля.

Сумма задатка: 150 508,17 белорусского рубля.

Шаг аукциона: 150 508,17 белорусского рубля.

Продавец имущества: ЗАО «ТОПЗАПЭЛЕКТРО», 220030, г. Минск, ул. Карла Маркса, 25-12Н, тел. 8017 338 16 15.

Организатор торгов: ликвидатор ЗАО «ТОПЗАПЭЛЕКТРО», 220121, г. Минск, ул. Притыцкого, 39-8Н, тел. 8017 338 16 15.

Условие торгов: торги проводятся в порядке, установленном Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (договор о задатке), внесшие в установленном порядке задаток, а также предоставившие организатору торгов следующие документы:

- заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов);
- копию свидетельства о регистрации и подлинник для заверения (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей);
- копию устава либо учредительного договора и их подлинники для заверения (для юридических лиц);
- копию платежного документа о внесении задатка с отметкой банка;
- документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица;
- оригинал документа, удостоверяющего личность, и его копия для заверения, а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет № BY20OLMP30120000826580000933 в ОАО «Белгазпромбанк», г. Минск, БИК OLMPBY2X, получатель – ЗАО «Топзапэлектро», УНП 100896485.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (единственному частнику аукциона) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов, которая отражается в протоколе о продаже предмета торгов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (единственным участником аукциона) подписывается в течение 5 календарных дней со дня проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (единственным участником аукциона) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **13 декабря 2020 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 39-8Н. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 04.12.2020 по 10.12.2020 включительно** в рабочие дни с 10.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 15.00) по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 39-8Н. По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону: (017) 338 16 15.

Телефон для справок: (017) 338 16 15 (ЗАО «ТОПЗАПЭЛЕКТРО»).

ГРОНКІ ГНЕВУ

Як раскалолася Польшча?

У Польшчы ўжо больш за месяц працягваюцца маштабныя пратэсты. 22 кастрычніка Канстытуцыйны суд краіны прызнаў незаконным перапыненне цяжарнасці пры наяўнасці цяжкіх і невылечных дэфектаў у плода. Гэта было падставай амаль для 98 працэнтаў абортаў у краіне, у якой дзейнічае адно з самых жорсткіх заканадаўстваў у адносінах да жанчын, паведаміў Euronews. Як адзначаюць аналітыкі, вердыкт Канстытуцыйнага суда стаў трыгерам народнага гневу. Рашэнне з невядомых прычын пакуль не ўступіла ў сілу, але сітуацыя як ніколі абвостраная — у краіне не сціхаюць пратэсты, а рэйтынг партыі ўлады няўхільна зніжаецца, адзначае Бі-бі-сі. Як раскалолася Польшча і чым можа скончыцца адзін з самых сур'ёзных грамадска-палітычных крызісаў?

АПОШНЯЯ КРОПЛЯ

Стаўленне палякаў да спрэчнага рашэння Канстытуцыйнага суда ў канцы кастрычніка даследавалі аж чатыры апытанні, праведзеныя рознымі сацыялагічнымі цэнтрамі. Іх вынікі даволі адназначныя: падтрымліваюць рашэнне ад 13 да 25 працэнтаў палякаў, адмоўна ацэньваюць — ад 66 да 69 %. Пры гэтым сацыёлагі звяртаюць увагу: серыю акцый пратэсту супраць гэтага рашэння вылучае яе маштабнасць — маніфестацыі прайшлі больш чым у 600 польскіх гарадах і мястэчках па ўсёй краіне. «У Польшчы жывуць мільёны жанчын, якія калі-небудзь перарываюць цяжарнасць. Даследаванні паказваюць, што такіх каля 25 % дарослых жанчын. Кожная чацвёртая! А гэта значыць, што аборт — гэта частка іх жыцця. І калі паглядзець на структуру гэтых абортаў, то ў большай ступені гэта будуць вёскі і маленькія мястэчкі», — заўважыў у інтэрв'ю Gazeta Wyborcza сацыёлаг Марцін Дума.

Таму не варта здзіўляцца таму, што на цяперашнія пратэсты выйшлі нават жыхары сельскіх рэгіёнаў паўднёва-ўсходняй Польшчы, якія лічацца электаральнай базай кіруючай партыі «Права і справядлівасць». «Гэта было вельмі спантанна, імпульсіўна. Я ніколі ў жыцці не ўдзельнічала ні ў якіх пратэстах, і такіх, як я, вельмі шмат, — расказала Бі-бі-сі Марына, жыхарка 10-тысячнага гарадка Любачаў, размешчанага за лічаныя кіламетры ад украінскай мяжы. — Але тут — нават я адчула, што гэта апошняя кропля».

КАНЕЦ КАРНАВАЛУ

Вельмі хутка стала зразумела, што вуліцы польскіх гарадоў запаўняюць не толькі праціўнікі забароны абортаў — з маршаў за правы жанчын гэтыя акцыі ператварыліся ў дэманстрацыі супраць уладаў у шырокім сэнсе. «[Рашэнне суда] стала іскрай. «Выбухоўка» была закладзена яшчэ раней. [Яшчэ з восені мінулага года] нарасталі розныя праблемы, рэформы забуксавалі, цэны раслі, надзеі розных сацыяльных груп не апраўдаліся, спрэчкі з ЕС... Адчуванне канца карнавалу было паўсюдным. І тут прыйшла пандэмія, якая паказала бяссілле ўлады», — заўважыў Gazeta Wyborcza сацыёлаг Яцэк Рацыборскі.

Асобным адрасатам гневу пратэстоўцаў стала надзвычай уплывовая ў Польшчы каталіцкая царква. Рашэнне Канстытуцыйнага суда Польшчы аб абортах віталі рэлігійныя рухі і арганізацыі кансерватыўнага кірунку. Арцыбіскуп Кракаўскі Марэк Едрашэўскі «высока ацаніў рашучасць» суддзяў у справе абароны жыцця чалавека «ад моманту зачацця да натуральнай смерці». Старшыня Канферэнцыі каталіцкіх біскупаў Польшчы Станіслаў

Гадзецкі назваў рашэнне суда яшчэ адным пацвярджэннем таго, што «развагі пра жыццё, якія не варта пражываць, супярэчаць прынцыпам дэмакратычнай дзяржавы і вяршэнства закона». Не дзіўна, што часта пратэстоўцы праводзілі акцыі паблізу рэзідэнцый біскупаў, а ў некаторых гарадах нават пратэставалі ўнутры касцёлаў.

«Царква лезе ва ўсе сферы нашага жыцця. У маіх дзяцей адкрываеш падручнік па любым прадмеце — а там папа Ян Павел II. Урад не зрабіў нічога, каб пазбегнуць другой хвалі каранавіруса. І ў гэтай сітуацыі яны робяць што? Паказваюць, што жанчыне рабіць з яе целам!» — абураецца Марына, суразмоўніца Бі-бі-сі.

Упершыню ў Польшчы з такой сілай гучыць non possumus («не можам») — формула катэгарычнай адмовы, якую выкарыстоўвае папскі прастол у адказ на патрабаванні свецкай улады, — толькі цяпер гэта кажа польскай царкве свецкая грамадскасць, адзначыў журналіст выдання Gazeta Wyborcza Міхал Альшэўскі. «Ужо зараз зразумела, хто прайграў гэтую бітву: рэпутацыя царквы абвалілася, і няма ніякай магчымасці яе аднавіць», — лічыць публіцыст.

Журналіст і пісьменнік Томаш Церлікоўскі пацвярджае, што каталіцкая Польшча, якой мы яе ведаем, перастае існаваць, перадае svoboda.org. «Гэта адбываецца проста зараз, на нашых з вамі вачах. Па-першае, моладзь, якая заўсёды была вельмі моцным элементам польскага каталіцызму, апынулася па-за царквой. Па-другое, сама каталіцкая царква не наладзіла камунікацыі з маладымі людзьмі. Няма мовы, на якой можна было б з імі размаўляць на розныя тэмы. Па-трэцяе, упершыню пасля падзення камуністычнага рэжыму мы назіраем спробы палітыкаў карумпаваць царкву. Можна сказаць, што цяпер гэта відаць лепш за ўсё. Па-чацвёртае, памылкі самой царквы: сексуальныя скандалы, няўменне спраўляцца з імі. Усё гэта прыводзіць да таго, што Польшча становіцца грамадствам, у якім моладзь, хутчэй за ўсё, адмаўляецца ад рэлігіі.

ПА ПАНЯДЗЕЛКАХ — БЛАКАДЫ, ПАСЛЯ — ФЛЭШМОБЫ

Галоўны рэдактар часопіса Res Publica Nowa Марцін Забароўскі мяркуе, што ўлады «гуляюць» з грамадскай думкай. Паводле яго слоў, шуміха вакол рашэння Канстытуцыйнага суда і пратэсты дапамагаюць ураду адцягнуць увагу ад сітуацыі з каранавіруснай пандэміяй. Забароўскі нагадвае, што гэта ўжо не першая спроба зрабіць больш жорсткім законы аб абортах. У 2016-м пасля «Чорнага пратэсту» з удзелам дзясяткаў тысяч жанчын партыя «Права і справядлівасць» адмовілася ад такога законапраекта. «Не здзіўлюся, калі яны пойдуць да гэтай жа хітрасці і цяпер», — разважае Забароўскі.

Пытанні пра аборты разглядалася пасля таго, як крыху заціхлі пратэсты супраць перавыбрання прэзідэнта Польшчы Анджэя Дуды, які і сам выступаў за ўзмацненне жорсткасці заканадаўства па адпаведным аспекце. Кансерватыўныя і рэлігійныя арганізацыі называюць ядром яго электарату, а пытанне аб «традыцыйных каштоўнасцях» стала ледзь не галоўным полем бітвы на выбарах. Па афіцыйных даных, Дуда перамог з вельмі невялікай перавагай — у межах «арыфметычнай хібнасці»: у другім туры ён апярэдзіў свайго апанента Рафала Тшаскоўскага ўсяго на два працэнты. Натуральна, паўсталі пытанні датычна фальсіфікацый. Як заўважыў gazeta.ru старшыня Балканскага клуба Цэнтра даследавання краін Усходняй Еўропы МДІМА Сяргей Арцёмаў, унутры дзяржавы існуе сур'ёзны раскол, што прадэманстравалі апошнія прэзідэнцкія выбары.

Не дзіўна, што лозунгі за адстаўку Анджэя Дуды і ўрада гучаць асабліва часта на вулічных акцыях супраць забароны абортаў. Гэта звязана яшчэ і з тым, што рашэнне Канстытуцыйнага суда было прынята па запыце дэпутатаў кіруючай партыі. Кіраўнік еўрапейскага аддзялення міжнароднай арганізацыі «Цэнтр рэпрадуктыўных правоў» Лея Хоктар называе гэта «палітычнымі гульнямі з жыццямі жанчын».

Сацыёлагі кажуць аб сур'ёзным падзенні падтрымкі партыі ўлады. Апытанні сацыялагічнай фірмы IBRIS паказваюць, што калі месяц таму рэйтынг кіруючай партыі «Права і справядлівасць» складаў 42 працэнты, то цяпер — толькі 27 працэнтаў. Падзенне рэйтынга, аднак, зусім не азначае росту папулярнасці апазіцыі, адзначае кіраўнік IBRIS Марцін Дума. Паводле яго слоў, прыкладна кожны пяты выбаршчык партыі ўлады ўзору 2019 года заяўляе, што не збіраецца ўдзельнічаць у выбарах. Іншыя — расчараваліся, назаўсёды або на час, у «Праве і справядлівасці» і пакуль што не бачаць, за каго маглі б аддаць свой голас.

Пры гэтым слабая і раз'яднаная польская апазіцыя ў арганізацыі акцый пратэсту адыграе хіба што эпізадычную ролю. Каардынацыю масавых выступленняў паспрабаваў узяць на сябе «Агульнапольскі страйк жанчын» — нефармальная арганізацыя, створаная пасля папярэдняй хвалі пратэстаў супраць забароны абортаў у 2016 годзе.

Апошнім часам маштаб акцый крыху паменшыўся, згаджаецца у размове з Бі-бі-сі адна з каардынатараў АСЖ пісьменніца Клемянціна Суханава. Але гэта зусім не значыць, што пратэсты ў Польшчы згасаюць. «Мы гуляем удоўгую. Мы вядзём перамовы аб арганізацыі агульных забастовак з прафсаюзамі. Мы ўсё гэта бачым у доўгай перспектыве», — расказвае Суханава Бі-бі-сі. Тактыка пратэстоўцаў у найбліжэйшы час будзе простая, тлумачыць яна: кожны панядзелак — «блакады вуліц, дарог, важных будынкаў». У астатнія дні актывісты па ўсёй Польшчы праводзяць менш маштабныя акцыі і флэшмобы.

Тым часам стала вядома, што ў дзясятках гарадоў Польшчы ў знак пратэсту было адключана асвятленне. У акцыі ўзялі ўдзел Варшава, Гданьск, Кельцы, Эльблянг, Кракаў, Глівіцы, Вроцлаў, Беласток, Катавіцы і іншыя населеныя пункты. Такім чынам улады гарадоў пратэстуюць супраць абмежавання магчымасці органаў мясцовага самакіравання распараджацца сродкамі з падатковых паступленняў. Абурэнне мясцовых уладаў таксама выклікаюць дзеянні польскага ўрада, які плануе накласці вета на новы бюджэт ЕС. На думку кіраўнікоў гарадоў, гэта можа заблакаваць паступленне сродкаў з еўрапейскіх фондаў.

Як бачым, сітуацыя ў Польшчы — стос вострых праблем, рэальная магчымасць вырашэння якіх пад вялікім пытаннем. Вось чым варта займацца польскім уладам, а не бессаромна ўмешвацца ва ўнутраныя справы нашай дзяржавы. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падчас сесіі Савета калектыўнай бяспекі АДКБ звярнуў увагу на супрацьстаянне шэрагу суседніх краін Беларусі. «Асабліва звяртаюць на сябе ўвагу літаральна ашалелыя паводзіны Польшчы і краін Балтыі супраць Беларусі, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Прычым мы выразна бачым, што іх дзеянні забяспечваюць рэалізацыю ўласных інтарэсаў і накіраваны на павышэнне сваёй значнасці ў Еўрасаюзе. І я хачу, каб аб непрыстойных і бессаромных паводзінах палітыкаў пачулі простыя людзі гэтых суседніх з намі краін».

Пётр ДУНЬКО.

❍ **ДАСЛОЎНА**

Супраць двайных стандартаў

Беларусь будзе процістаяць спробам выкарыстання ў краіне рэвалюцыйных метадаў, у тым ліку заяўляючы аб сваёй пазіцыі на міжнароднай арэне. Аб гэтым **міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ** заявіў журналістам па выніках сумеснай калегіі знешнепалітычных ведамстваў Беларусі і Расіі, паведаміла БелТА.

Міністр прывёў прыклады палітыкі двайных стандартаў і рознай рэакцыі заходніх краін на падобныя падзеі ў Беларусі і іншых дзяржавах. Пры гэтым ён зрабіў акцэнт на неправамернасці і контрпрадуктыўнасці спроб рэвалюцыйным шляхам змяніць уладу ў Беларусі. «Я таксама за перамены, але яны павінны праходзіць эвалюцыйным спосабам, спакойна, у рамках удасканалення заканадаўства, праз унутрынацыянальны дыялог, удасканаленне Канстытуцыі, але ні ў якім разе не праз рэвалюцыю, якая нічога добрага не прынясе ні краіне, ні народу», — сказаў ён.

«Мы бачым тое, што адбываецца, адэкватна ацэньваем сітуацыю, і мы не дапусцім, каб такія рэвалюцыйныя метады выкарыстоўваліся ў Беларусі, — дадаў Уладзімір Макей. — Вядома, мы будзем процідзейнічаць гэтым спробам на міжнароднай арэне разам з нашымі партнёрамі ў рамках і АДКБ, і Саюзнай дзяржавы, і СНД, і іншых структур».

Міністр звярнуў увагу, што Беларусь апошнім часам знаходзіцца ў фокусе міжнароднай інфармацыйнай увагі, але «ў асноўным у негатыўным кантэксце». Пры гэтым заходнееўрапейская супольнасць, на яго думку, раздзяляе іншыя краіны на сваіх і чужых. Праблемы ў «сваіх» яны не заўважаюць, а «чужых» — «б'юць наводмаш» за аналагічныя праблемы. У якасці прыкладу ён прывёў сітуацыю з публікацыяй крытычнага артыкула ў нямецкай газеце пра Анджэя Дуду напярэдадні выбараў. Гэты артыкул быў расцэнены польскім бокам як умяшанне ва ўнутраныя справы. Іншы прыклад — дэманстрацыі ў Польшчы супраць закона аб забароне абортаў. Прэм'ер-міністр гэтай краіны называе іх дзяржаўным злачынствам, а пратэсты ў Беларусі лічыць нармальнай рэалізацыяй правоў чалавека. «Гэта двайныя стандарты. Мы будзем актыўна процідзейнічаць гэтаму на міжнароднай арэне», — запэўніў Уладзімір Макей.

Нефармат

ЯК МЯНЕ Ў ЧУЖЫ ДОМ І ЧУЖУЮ КВАТЭРУ ПАСЯЛІЛІ

Дакладна не прыпомню, можа, і згадвала калі той кур'ёзны выпадак з маімі старэйшымі знаёмымі. Было гэта недзе аж у сямідзясятыя. Сяброўкі-брастаўчанкі добра пасядзелі ў рэстаране, а той, якая пасядзела «найлепш», выклікалі таксі. Дама нападпітку павольна апусцілася на задняе сядзенне, ціха вымавіла адрас: «Дом № такі, вуліца 17 пагранічнікаў» — і заснула. Кіроўца ледзь не з'ехаў з глузду. У Брэсце ёсць вуліца 17 Верасня і паралельная ёй — Савецкіх пагранічнікаў. Дык куды везці пасажырку?

Дакладна не ведаю, як ён выйшаў з той сітуацыі, мабыць, усё ж давялося раскатурхаць кліентку і ўдакладніць дыслакацыю, а потым расказваць калегам гэты выпадак як анекдот. А мне вось было не да смеху, калі даведалася, што і мяне пэўныя службы пасялілі, вобразна кажучы, на тую ж 17 пагранічнікаў. Але аб усім па парадку.

На мінулым тыдні мне патэлефанавалі з бухгалтэрыі і паведамілі, што на работу прыйшла папера аб прымусовым спагнанні з маёй зарплаты грошай за неаплачаны штраф. Супрацоўніца зачытала па тэлефоне пастанову аддзела прымусовага выканання, дзе гаворыцца, што мая машына 29 чэрвеня, рухаючыся па трасе М1, перавысіла хуткасць, за што быў накладзены штраф. Справа жыццёвая. З той пары, як на дарозе ўстаноўлены камеры, мабыць, цяжка знайсці аўтааматара, які не здзейсніў падобнае правапарушэнне. Але ўсе аўтааматары звычайна атрымліваюць паведамленні аб парушэнні ПДР па пошце, а не дазнаюцца ў сваёй бухгалтэрыі, калі гэты штраф спаганяюць прымусова. Ніхто ж, відаць, не захацеў бы за 13 рублёў фігураваць ва ўсіх базах не толькі як парушальнік, але і як злосны неплацельшчык.

І калі мне ўдалося азнаёміцца з названым дакументам, то здзіўленню не было канца. Там усё было правільна: маё імя і прозвішча, марка і нумар машыны, месца работы, вуліца, на якой пражываю, нумар кватэры... А вось нумар дома ўказаны той, дзе я пражывала 11 гадоў таму. Значыць, хутчэй за ўсё, і ліст аб парушэнні быў накіраваны вось на гэты дзіўны адрас: з домам старым, а кватэрай новай. Ну, і згубілася там у часе і прасторы.

Можаце ўявіць сабе абурэнне і жаданне высветліць, хто зрабіў з мяне неплацельшчыка і чаму?.. Ветлівая дзяўчына на тэлефоне гарачай лініі ў аддзеле прымусовага выканання растлумачыла, што ўсе даныя бяруцца з базы аддзелаў па грамадзянстве і міграцыі, якія выдаюць пашпарты і вядуць рэгістрацыю, туды і трэба звяртацца.

У названым аддзеле сапраўды высветлілася, што я значуся як жыхарка дома № 4 кватэры 57. У доме № 4 я пражывала да 2009 года, але кватэра была іншая. А з указанага года жыву ў кватэры 57 іншага дома. Вуліца засталася ранейшая. Калі рэгістравалі па новым адрасе, нехта з-за секундная няўважлівасці памыліўся, зрабіў адзін адрас з двух, і гэтая памылка захоўвалася 11 гадоў. Службовая асоба, якая мяне прымала, папрасіла прабачэння, абяцала ўсё паправіць, а потым спытала: «Чаму ж вы раней не прыйшлі да нас?»

Цікавае пытанне. Я пражыла так 11 гадоў і, відаць, спакойна жыла б далей, нічога не падазраючы — нас жа ніхто пры рэгістрацыі, пры выдачы пашпарту не папярэджвае, што звесткі паступаюць у базу, якой карыстаецца шэраг арганізацый. Праўда, аднойчы быў выпадак, калі можна было б насцярожыцца. З падатковай інспекцыі раёна, дзе знаходзіцца мой вясковы дом, перасталі прыходзіць рахункі на штогадовы падатак. Я пазваніла туды ўдакладніць, яны сказалі, што адпраўлялі, і зачыталі адрас з гэтым самым домам № 4. І тады дзяўчына з падатковай нешта быццам заікнулася пра базу, а я яшчэ пажартавала, маўляў, хто ж той містар Х, трымальнік няправільнай базы, якому трэба выказаць прэтэнзіі. Мая тэлефонная абанентка, нібы нечага спужаўшыся, адразу папрасіла прабачэння і паабяцала памылку выправіць. І праўда, пасля таго здарэння лісты з «падатковай» сталі прыходзіць на хатні адрас. А загадкавы «містар Х» праявіў сябе зноў вось такім чынам.

З супрацоўніцай аддзела па грамадзянстве і міграцыі мы таксама пажартавалі наконт таго, куды ж мяне пасялілі яе калегі і да каго: можа, багаты ці знакаміты. Добра, як той казаў, што добра канчаецца. А вось мае калегі «намалявалі» іншы магчымы сцэнарый: «Парушэнне было 29 чэрвеня, табе гэта стала вядома ў канцы лістапада. Нескладана ўявіць сітуацыю: у цябе аплачана пуцёўка на адпачынак, рэгіструешся на рэйс, а цябе не пускаюць у самалёт за тыя самыя неаплачаныя 13 рублёў, пра якія табе, як той казаў, і ў сне не снілася. І ўжо нікога не цікавіць, што ў цябе прападае вялікая сума грошай, зрываецца адпачынак і ў колькі нерваў усё гэта абыходзіцца табе і тваёй сям'і». Вось тут ужо не да смеху і жартаў. Як пісаў адзін з маіх любімых блогераў: «Такое здараецца нячаста, але рызыкі трэба ўлічваць».

Святлана ЯСКЕВІЧ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.08	16.50	7.42
Віцебск —	9.05	16.33	7.28
Магілёў —	8.58	16.40	7.42
Гомель —	8.47	16.45	7.58
Гродна —	9.22	17.07	7.45
Брэст —	9.15	17.16	8.01

Месяц

Поўня 30 лістапада. Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Ганны, Анатоля, Астапа, Івана, Іпата, Ісака, Рыгора, Уладзіміра.*
К. *Клаўдзіі.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

3 СНЕЖНЯ

У краіне

1912 год — нарадзіўся Мікалай Васілевіч Турбін, селекцыянер-генетык, акадэмік НАН Беларусі, акадэмік УАСГНІЛ, доктар біялагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. У 1953—1963 гадах — дырэктар Інстытута біялогіі АН БССР, у 1965—1971 — дырэктар Інстытута генетыкі і цыталогіі АН БССР. У 1971—1974 гг. — акадэмік-сакратар аддзялення раслінаводства і селекцыі УАСГНІЛ, у 1974—1980 гадах — дырэктар НДІ прыкладной малекулярнай біялогіі і генетыкі УАСГНІЛ. Аўтар больш як 350 навуковых прац, у тым ліку 8 манаграфій. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

1945 год — нарадзілася Альбіна Аляксандраўна Шагідзевіч, беларуская актрыса, педагог, кандыдат мастацтвазнаўства, прафесар. У 1967-м скончыла Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. У 1967—1969 гадах працавала ў Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы, у 1969—1971 гг. — у Беларускім рэспубліканскім тэатры юнага гледача, у 1974—2002 гг. — у Беларускай акадэміі мастацтваў. Паставіла больш за 30 літаратурна-драматычных кампазіцый і спектакляў паводле твораў сучасных і замежных пісьменнікаў. Аўтар навуковых работ па сцэнічным маўленні, артыкулаў па тэатральным мастацтве і педагогіцы.

2010 год — адкрыўся пасля рэканструкцыі мытны пункт «Беняконі». У выніку яго прапускная здольнасць на ўчастку беларуска-літоўскай мяжы павялічылася ў 2,5 раза.

У свеце

1795 год — нарадзіўся Роўленд Хіл, англійскі педагог і адміністратар, стваральнік сучаснай пошты. Яго прапановы па рэформе паштовай службы (у тым ліку аб папярэдняй аплаце ўсіх адпраўленняў) прывялі да з'яўлення паштовай маркі.

1895 год — нарадзіўся Юрый Сяргеевіч Нікольскі, рускі кампазітар і дырыжор. Адзін з першых кампазітараў, якія стваралі музыку для радыёпастановак і кіно, аўтар дзіцячых песень, музычных застаўак да папулярных дзіцячых перадач.

1900 год — нарадзіўся Рыхард Кун, нямецкі вучоны ў галіне хіміі і біяхіміі вітамінаў, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па хіміі.

1910 год — на Парыжскім аўтасалоне была ўпершыню прадэманстравана неонавая лямпа, вынайдзеная французскім фізікам Жоржам Клодам.

1930 год — нарадзіўся Жан Люк Гадар, французскі рэжысёр, сцэнарыст. Адзін з адметных прадстаўнікоў кірунку французскай «новай хвалі» ў кінематографе. Паставіў фільмы «Кітаянка», «Новая хваля» і іншыя.

Так гаварыў...

АЛЬБЕРТ ЭЙНШТЭЙН:
«Ніякая мэта не настолькі высокая, каб апраўдаць ганебныя сродкі для яе дасягнення».

УСМІХНЕМСЯ

— У цябе, напэўна, жонка прыгажуня?

— Канешне! А як вы здагадаліся?

— Ну, сам ты дык неяк не вельмі, а дзеці сімпатычныя...

— Гэта праўда, што ты выйшла замуж за палітыка?

— Так...

— І як яно?!

— Вельмі незадаволеная, ён кожны вечар ходзіць вакол ложка, махае рукамі і расказвае, як нам ноччу будзе добра!

Нашы дзеці — як грошы: якія б ні былі вялікія, заўсёды здаюцца маленькімі...

Маленькі Ігнат пытаецца:

— Цётачка Соня, а навошта ты ўвесь час фарбуешся?

— Каб быць прыгожай.

— І калі гэта спрацуе?

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3697. Нумар падпісаны ў 19.30 2 снежня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12